Вядомыя шлягеры – на Дзень нараджэння Песняра!

СТАР. 3

Якія прафесіі патрэбны краіне?

СТАР. 5

Кітайская паэзія... па-беларуску

СТАР. 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

4 ЛЮТАГА 2015 г. СЕРАДА № 21 (27879) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Рыхтуецца закон

КАЛІ ПРЫМІРЭННЕ ВАЖНЕЙШАЕ ЗА ПАКАРАННЕ

У Палаце прадстаўнікоў распрацоўваецца законапраект аб укараненні медыяцыі ў Крымінальны кодэкс

Медыяцыя як альтэрнатыўны суду метад вырашэння канфліктаў развіваецца ў нашай краіне з 2011 года. У 2013 годзе заканадаўча была вызначана сфера яе дзейнасці — грамадзянскія праваадносіны, працоўныя і сямейныя спрэчкі. Цяпер у ніжняй палаце парламента распрацоўваецца законапраект, які закліканы ўвесці медыяцыю і ў крымінальны працэс. «Звязда» распытала намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Уладзіміра ЧАРАВАЧА пра асаблівасці вырашэння канфліктаў праз прымірэнне ў выпадку здзейсненага злачынства.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Уладзімір Алегавіч, чым адрозніваецца медыяцыя ў грамадзянскай і крымінальнай судавытворчасцях?

— Гэта розныя рэчы па сутнасці. Калі ў першым выпадку медыяцыя выступае як форма вырашэння гаспадарчай ці грамадзянска-прававой спрэчкі, то ў другім — як форма канцэпцыі аднаўленчага правасуддзя, звязаная з вызваленнем ад крымінальнай адказнасці ці змяншэннем крымінальнага пакарання.

— Што такое аднаўленчае правасуддзе?

— Канцэпцыя аднаўленчай юстыцыі з'явілася ў апошнія дзесяцігоддзі. Гэта заканамерная праява сучасных тэндэнцый развіцця крымінальнага працэсу. Сацыяльна-эканамічныя змены, паскарэнне тэмпу жыцця людзей, развіццё новых тэхналогій і іншыя фактары ўплываюць на тыя формы, якія дзяржава абірае для барацьбы са злачыннасцю. Яе ўзровень цяпер застаецца адносна высокім, нягледзячы на невялікія ваганні, якія рэгіструюцца ў той ці іншы справаздачны перыяд. У тэорыі права нават паўстала пытанне пра «крызіс пакарання» і патрэбу распрацоўкі новых тэорый і альтэрнатыўных практык рэагавання на крымінальныя злачынствы.

Аднак не толькі высокі ўзровень злачыннасці ўплывае на змяненні крымінальнага працэсу, але і пэўныя праблемы, з якімі сутыкаецца практыка. У прыватнасці праблема забеспячэння праў асобы ў працэсе, нізкая эфектыўнасць забеспячэння праў пацярпелых і рэальнай кампенсацыі шкоды, прычыненай злачынствам, і г.д. Гэта і іншае прыводзіць да патрэбы пошуку новых рашэнняў, новых падыходаў да барацьбы са злачыннасцю, да змены сістэмы крымінальнага працэсу з тым, каб яна працавала эфектыўна.

У тэорыі права паўстала пытанне пра «крызіс пакарання» і патрэбу распрацоўкі новых тэорый і альтэрнатыўных практык рэагавання на крымінальныя злачынствы.

Аднаўленчая юстыцыя па сваёй сутнасці прапануе новы падыход да разумення прыроды злачынства, а таксама да правасуддзя. У яе аснове ляжаць ідэі прымірэння і альтэрнатыўных спосабаў вырашэння канфліктаў, заснаваныя на пошуку кансэнсусу, у процівагу традыцыйнай канфрантацыі бакоў.

Самая пашыраная форма, якая выцякае з гэтай канцэпцыі, — медыяцыя. Гэта значыць, добраахвотнае дасягненне пагаднення падчас вырашэння крымінальна-прававога канфлікту паміж пацярпелым і парушальнікам права праз прымірэнне.

— Як працэдура прымірэння адбываецца ў выпадку здзейсненага злачынства?

— Працэдуру праводзіць адмыслова падрыхтаваны медыятар. Для ўсіх мадэляў медыяцыі характэрна, па-першае, добраахвотнасць удзелу: медыяцыя мае месца, калі абодва бакі крымінальна-прававога канфлікту выказваюць жаданне ўдзельнічаць у дадзенай працэдуры.

Таксама яна носіць нефармальны характар: цалкам адсутнічае рэгламентацыя дзеянняў удзельнікаў. Інфармацыя, атрыманая падчас медыяцыі, мае прыватны характар. А асноўная мэта медыяцыі — выпрацоўванне рашэння, якое задаволіць усіх удзельнікаў канфлікту.

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НЕ ГАЛАЛЁДЗІЦА — КОЎЗАНКА!

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:

«Усяго ў нас у краіне 19,5 тысячы дэпутатаў базавага ўзроўню. І калі ўвесь гэты патэнцыял задзейнічаць, то вельмі шмат пытанняў можна вырашаць на месцах. Гэта дазволіць папярэджваць і не дапускаць з'яўлення канфліктных сітуацый. Кожны дэпутат падчас сваёй работы павінен унікаць у тыя праблемы і патрэбы людзей, якія стаяць на парадку дня: для гэтага ёсць магчымасці. Адначасова не хацелася б, каб набірала вялікую сілу хваля ўтрыманства. Таму трэба актыўна працаваць з моладдзю ў школах і сацыяльных установах, таму што той, хто ўдзельнічае ў арганізацыі і падтрыманні парадку, атрымлівае асаблівае выхаванне».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.02.2015 г.

Долар ЗША	15420,00	▼
Еўра	17480,00	▲
Рас. руб.	228,00	▲
Укр. грыўня	952,04	▼

■ Падзея

СЛОВА ЯДНАЕ

28 краін прымуць удзел у XXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы

Беларускі форум, які пройдзе з 11 па 15 лютага, адкрые сусветны кніжны каляндар на гэты год, таму будзе ў цэнтры ўсеагульнай увагі, адзначыла міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ. І нам ёсць што паказаць, упэўнена яна:

— Мы па-ранейшаму застаёмся чытаючай краінай. На аднаго чалавека прыходзіцца 3,3 экзэмпляра кніг. У мінулым годзе ў Беларусі было выдадзена 11613 найменняў агульным тыражом 31,2 мільёна экзэмпляраў. Выданне кніг на роднай мове ўжо тры-чатыры гады трымаецца на прыблізна аднолькавым узроўні — гэта 10-11% ад агульнай колькасці. Свет пабачылі энцыклапедыі, сярод якіх традыцыйныя серыі «Гарады і вёскі Беларусі», «Рэгіёны Беларусі». Мы працягваем выдаваць шматтомнікі класікаў: завершаны выхад збору твораў Івана Шамякіна, працягваецца выданне твораў Уладзіміра Караткевіча. Шмат увагі аддаецца і нашай гісторыі: з'явіліся новыя кнігі пра Радзівілаў, таксама выданні, прысвечаныя адраджэнню слуцкіх паясоў.

Яскравай старонкай выставы стане міжнародны сімпозіум літаратараў пад назвай «Пісьменнік і час». Дзея будзе скіраваная на тое, каб аб'яднаць пісьменніцкую суполку свету, каб праз словы творцаў спрыяць міру і ўзаемаразуменню паміж рознымі нацыямі. Жаданне паўдзельнічаць у абмеркаваннях выказалі пісьменнікі з 16 краін. На самім жа кірмашы чакаецца рэкордная колькасць удзельнікаў — ажно 28 краін прапануюць свае навінкі.

Ганаровым госцем выставы, якая пройдзе на галоўнай выставачнай пляцоўцы краіны на праспекце Пераможцаў, 14, сёлета стане Кітай. У тым, што культурна-асветніцкія стасункі ў нашых краінах сапраўды трывалыя, упэўнены **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Цуй ЦЫМІН**:

— Нашай дэлегацыі надзвычай прыемна быць ганаровым госцем XXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы. Мы прадставім 45 нашых выдавецтваў, пакажам каля 5 000 самых якасных кніг. Ужо падрыхтавана 35 выдавецкіх мерапрыемстваў, у тым ліку цырымонія адкрыцця і ўрачыстай перадачы кніг Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Я хачу адзначыць, што беларусы — нашы добрыя і праверэныя сябры. Ужо 23 гады, з моманту ўсталявання дыпламатычных адносінаў, стасункі развіваюцца дынамічна, устойліва. Асабліва з 2003 года, калі кіраўнікі нашых дзяржаў прынялі рашэнне аб двухбаковым стратэгічным партнёрстве. Ужо бачны вялізны поспех нашых адносінаў ва ўсіх сферах, у тым ліку ў гуманітарнай.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дарэчы, добрыя літаратурныя стасункі з Кітаем нас звязваюць ужо цэлае стагоддзе. Пра гэта распавёў **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**:

— Мы падрыхтавалі цэлы шэраг выданняў, прысвечаных беларуска-кітайскаму сяброўству. Нядаўна выйшла кніга пад назвай «Беларусь вачыма кітайцаў»: у ёй наша краіна апісана праз бачанне гасцей з Паднябеснай — іх палітыкаў, журналістаў, навукоўцаў, якія бывалі ў нас у розныя часы. Адметна, што гэта кніга спачатку была выдадзеная ў Пекіне на кітайскай мове, а ўжо пазней мы яе выдалі ў сябе. Пераклад быў зроблены супрацоўнікамі Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Белдзяржуніверсітэта. Сёлета мы адзначаем 105-годдзе пачатку беларуска-кітайскіх літаратурных зносін. Менавіта 105 гадоў назад у газеце «Наша ніва» былі надрукаваныя кітайскія апавяданні і легенды ў перакладзе Васіля Аляксеева. У зборніку «Стагоддзе на знаёмства» мы сабралі літаратурныя творы Кітая, пачынаючы ад першага паэта, які жыў яшчэ да нашай эры, Цюй Юаня, да творцаў сярэдзіны мінулага стагоддзя. Акрамя гэтага, распачата літаратурная серыя пад назвай «Светлыя знакі: паэты Кітая». Двух з чатырох запланаваных кітайскіх паэтаў ужо можна прачытаць на беларускай мове.

Яшчэ адна ключавая тэма выставы — гэта 70-годдзе Вялікай Перамогі. З гэтай нагоды, дарэчы, быў праведзены конкурс плаката, пра што распавёў **рэктар Акадэміі мастацтваў Міхась БАРАЗНА**. Ахвотных паўдзельнічаць аказалася надзвычай шмат: было даслана больш за 380 работ з 7 краін СНД і Прыбалтыкі. Плакатнае мастацтва зноў стала жывым, атрымала магчымасць данесціць важныя ідэі да грамадства.

Такім чынам, роўна праз тыдзень нас чакае вялікае кніжнае свята. Кожны зможа знайсці, што пачытаць і каго паслухаць.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Прэзідэнт Польшчы паабяцаў не перашкаджаць Расіі святкаваць Дзень Перамогі

Польшча як краіна-арганізатар канферэнцыі аб сітуацыі ў Еўропе пасля Другой сусветнай вайны, якую плануецца правесці 8 мая на мысе Вестэрплатэ пад Гданьскам, не мае на мэце сапсаваць святкаванне Дня Перамогі ў Маскве 9 мая. Пра гэта заявіў прэзідэнт Польшчы Браніслаў Камароўскі ў эфіры радыёстанцыі «ТОК ФМ». Паводле яго слоў, мерапрыемства ў Вестэрплатэ планавалася даўно, гэтая ідэя не ўзнікла ў апошнія дні. Прэзідэнт расказаў, што на канферэнцыю запрасяць вядомых гісторыкаў, каб абмеркаваць завяршэнне вайны, адказаць на пытанне, ці было яно «вызваленнем або таксама з'яўленнем новых праблем». Каментуючы дыскусію, якая разгарэлася ў Еўропе пасля выказванняў кіраўніка польскага МЗС пра тое, салдаты якой нацыянальнасці вызвалялі Асвенцым, Браніслаў Камароўскі заўважыў: «Я паважаю факты, а яны такія, што Асвенцым вызвалілі салдаты Украінскага фронту, які быў часткай Чырвонай Арміі. Нашы сённяшнія спробы вылічыць, ці было там больш рускіх, украінцаў, кіргізаў або казахаў — гэта проста нонсэнс».

Літва на траціну павялічыла бюджэт Мінабароны

На фоне эскалацыі канфлікту ва Украіне краіны Балтыі павялічваюць выдаткі на абарону: асаблівых поспехаў дасягнула Літва, якая паднялася па гэтым паказчыку на 19-е месца сярод 28 краін НАТА, якія маюць армію. Раней яна знаходзілася на перадапошнім месцы, паведамляе мясцовае выданне Balsas са спасылкай на міністэрства абароны краіны. Паводле інфармацыі, прыведзенай на сайце, у 2015 годзе бюджэт міністэрства абароны ацэньваецца ў 425 мільёнаў еўра, што складае 1,11% ВУП.

Моладзь у найбольшай ступені пакутуе ад эканамічных узрушэнняў

Пра гэта заявіў генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун на маладзёжным форуме, які праходзіць у штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку. Каля 73 млн маладых людзей не могуць знайсці працу. Мільёны не могуць вырвацца з галечы, у тым ліку і тыя, хто жыве ў багатых краінах. Многія юнакі і дзяўчаты падвяргаюцца эксплуатацыі. У апошнія гады больш за 2,5 млн дзяцей у багатых краінах папоўнілі армію жабракоў. Сёння ў свеце пражывае беспрэцэдэнтная колькасць маладых людзей — 1,8 млрд. Яны па-ранейшаму сутыкаюцца з мноствам перашкодаў, у тым ліку з тымі, якія замінаюць ім знайсці месца на рынку працы. Дзясяткі мільёнаў дзяцей не ходзяць у школу, а калі і ходзяць, то не атрымліваюць нават мінімальна неабходнага ўзроўню ведаў. Да 60% маладых людзей у краінах, якія развіваюцца, не вучацца і не працуюць альбо перабіваюцца выпадковымі заробкамі.

КАРАТКА

Першыя рэгіянальныя аперацыі па перасадцы сэрца і аўтатрансплантацыі лёгкага паспяхова выкананы ў Брэсцкай абласной бальніцы. Сэрца было перасаджана 35-гадоваму пацыенту з дыягназам «дылатацыйная кардыяміяпатыя». У народзе такую хваробу называюць «бычынае сэрца». Аўтатрансплантацыя лёгкага была выкананая 56-гадоваму жыхару Кобрынскага раёна. У пацыента была пухліна верхняй долі правага лёгкага.

Банкі Беларусі выплацілі ў бюджэт Br1 трлн 393,6 млрд за час дзеяння валютнага збору.

Нацыянальны аэрапорт Мінск увёў у тэставую эксплуатацыю аўтаматызаваную сістэму выкліку таксі. Пасажыр, які прыляцеў, можа звярнуцца да дыспетчараў, што знаходзяцца ў будынку аэравакзальнага комплексу. Тыя выклічуць таксі і раздрукуюць пасажыру талон з нумарам аўтамабіля. На стаянцы, абсталяванай у цэнтры прывакзальнай плошчы, на спецыяльным экране таксіст убачыць, што яго машыну чакае кліент.

■ Лепшыя з лепшых

«СТУДЭНТ ГОДА» — КРЭАТЫЎНЫ ЮРЫСТ

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Аляксандра Малаканава і Аляксей Кутафін: мы — не сапернікі.

«Мы вучымся ў самым лепшым універсітэце краіны, а ўсе астатнія нам зайздросцяць. Гэта ў нашым «пацанскім» універсітэце самыя прыгожыя дзяўчаты... Толькі нашы студэнты ходзяць на заняткі, назвы якіх больш падобныя на праклёны. Нашы студэнты настолькі суровыя, што, здаўшы экзамен, пытаюцца на выхадзе, што яны здалі... Гэта нашы студэнты на 80 працэнтаў складаюцца з надзеі. Толькі нашы студэнты могуць, як Цэзар, рабіць тры справы адначасова: здаваць «лабу», курсач і экзамен».

Менавіта гэты ролік з вялікім адрывам перамог у намінацыі «Студэнт года ONLINE» ў рэспубліканскім конкурсе «Студэнт года — 2014». Яго аўтар — **студэнтка 3 курса факультэта радыётэхнікі і радыёэлектронікі БДУІР Наталля ВІННІКАВА**. Фінал, у якім сустрэліся пераможцы рэгіянальных этапаў, адбыўся на базе Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. У фінале было прадстаўлена восем вышэйшых навучальных устаноў: БДУІР, БНТУ, Камандна-інжынерны інстытут МНС, Магілёўскі інстытут МУС, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт і Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

КАЛІ ПРЫМІРЭННЕ ВАЖНЕЙШАЕ ЗА ПАКАРАННЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Якую ролю тут выконвае медыятар?

— Медыятар дапамагае выказаць і пачуць пункты гледжання, думкі, пачуцці бакоў, што фарміруе прастору паразумення. Самы важны вынік медыяцыі — аднаўленчыя дзеянні. Пад імі маюцца на ўвазе выбачэнне, прабачэнне, імкненне шчыра загладзіць прычыненую шкоду — такія дзеянні, якія дапамагаюць выправіць наступствы канфліктнай сітуацыі. Не менш важным вынікам медыяцыі можа стаць прымірэнчае пагадненне.

Такім чынам, увесь працэс медыяцыі накіраваны на вырашэнне галоўнага пытання пра тое, як можна ўрэгуляваць крымінальна-прававы канфлікт у дадзены момант і ў будучым. Увага ж крымінальнай судавытворчасці накіравана ў мінулае: здзейсніў абвінавачаны злачынства ці не здзейсніў, вінаваты ці не вінаваты ў здзяйсненні. На працягу ўсяго крымінальнага працэсу бакі супрацьпастаўляюцца адзін аднаму, пры гэтым яны нясуць пэўную працэсуальную функцыю (абвінавачання ці абароны) і адстойваюць сваю прававую пазіцыю па справе.

Апроч таго, падчас медыяцыі бакі самастойна прымаюць якія-небудзь рашэнні па крымінальна-прававым канфлікце з дапамогай медыятара. Але ён толькі праводзіць працэдуру прымірэння і не надзелены правам прыняцця якіх-небудзь рашэнняў па канфлікце. Што да традыцыйнага крымінальнага працэсу, то крымінальна-прававы канфлікт вырашаецца судом, які прымае ўладныя рашэнні.

— Якім чынам медыяцыя ў крымінальным справаводстве будзе адлюстравана ў беларускім заканадаўстве?

— Дэпутаты нашай камісіі распрацоўваюць праект закона аб укараненні інстытута медыяцыі ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс. Пад медыяцыяй тут разумеецца выкарыстанне інстытута вызвалення ад крымінальнай адказнасці, які дапускаецца ў вызначаных заканадаўствам межах і звязаны з канцэпцыяй аднаўленчай юстыцыі. Не варта лічыць, што вынікі ўжывання медыяцыі ў грамадзянскай ці гаспадарчай судавытворчасцях робяць немэтазгодным увядзенне яе ў крымінальнае судаводства, бо, маючы аднолькавую юрыдычную форму, гэтыя два прававыя інстытуты накіраваны на дасягненне розных мэт і задач.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Блізкая ўлада

ЭФЕКТЫЎНАЯ СУВЯЗЬ

Штосуботу, пачынаючы з 17 студзеня, старшыні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама і іх намеснікі праводзяць прамыя тэлефонныя лініі. Адметнасць гэтых дыялогаў у тым, што праблемныя пытанні, якія ўзнікаюць у грамадзян, вырашаюцца неадкладна, нягледзячы нават на выхадныя, без бюракратызму, цяганіны і пустой паператворчасці.

І ПРАЙСЦІ, І ПРАЕХАЦЬ!

На «прамую лінію» да **старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля ЛІСА** 17 студзеня звярнулася жыхарка аграгарадка Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна Таццяна Дулько. Сям'я Таццяны Іванаўны жыве ў раёне новай забудовы на вуліцы Бярозавай. Там пабудаваліся маладыя сем'і, якія маюць дзяцей. Штораніцы малых трэба адводзіць у садок, большых — у школу. А дарога на вуліцы ўяўляе сабой сапраўдную калатушу, па якой не праехаць і не прайсці, — скардзілася жанчына і прасіла паўплываць на сітуацыю. Старшыня Брэсцкага райвыканкама і кіраўнік адпаведнай дарожнай службы атрымалі тады ўказанне вывучыць праблему з выездам на месца і, пры магчымасці, прыняць меры.

У тэлефоннай размове з карэспандэнтам «Звязды» Таццяна Іванаўна сказала, што яна вельмі ўдзячная і губернатару, і іншым службовым асобам, што звярнулі ўвагу на іх зварот. Бо тэлефанавала яна ад імя ўсіх жыхароў сваёй вуліцы. Літаральна на чацвёрты дзень прыйшла тэхніка і пачаліся работы.

Дарогу падсыпалі, прагрэйдавалі, прывялі ў парадак. Цяпер можна нават боцікі на абцасах абуць, выходзячы з дому. Раней пра гэта і думаць не было як.

УВАГА ДА КОЖНАГА ЗВАРОТУ

Аляксандр ЛОГВІН, які ўзначальвае аддзел па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Гомельскага аблвыканкама, расказаў, што праблемы многіх ужо зняты.

Жыхары Столінскага раёна Брэсцкай вобласці звярнуліся да старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Дворніка з просьбай арганізаваць бясплатны падвоз іх дзяцей у Хільчанскую школу Жыткавіцкага раёна. Да гэтага бацькі вазілі дзяцей на заняткі за свой кошт. Цяпер жа школьны аўтобус заязджае ў вёску на Століншчыне і вязе хлопчыкаў і дзяўчатак вучыцца на Гомельшчыну. Пасля ўрокаў таксама бясплатна вяртае іх дадому.

Гамяльчанка Зінаіда Агеенка датэлефанавалася губернатару са скаргай на смурод, які не дае спакойна жыць усёй іх вуліцы ў прыватным сектары. Жанчына казала, што супрацоўнікі размешчанага ў акрузе мэблевага прадпрыемства паляць у печах шкоднымі адходамі вытворчасці. На месца выехалі адпаведныя службы і пераканаліся, што сапраўды заяўніца мела рацыю. Складзены адміністрацыйны пратакол, кіраўніцтву давядзецца выплаціць вялікі штраф. Да таго ж, дадаткова правераць, як вытворцы заключаць дагаворы і зойдуцца ўтылізацыяй адходаў па ўсіх правілах.

Гамяльчанка Надзея Ус папрасіла падключыць святло да яе дачнага дамка ў садоўніцкім таварыстве «Будаўнік» Гомельскага раёна. Там па адной з вуліц памянялі лінію электраперадач, але падключэнне да дамоў трэба было зрабіць за кошт грамадзян. Пенсіянерка папрасіла аказаць ёй дапамогу, што і было практычна адразу ж зроблена.

Жыхарка вёскі Азершчына Рэчыцкага раёна скардзілася, што ў вёсцы засталося некалькі вуліц, дзе дагэтуль не праклалі водаправод. Мясцовыя службы прапаноўвалі людзям фінансава паўдзельнічаць у долевым будаўніцтве — з-за дэфіцыту сродкаў. Аднак Уладзімір Андрэевіч даў даручэнне выдзеліць Br1,5 млрд на завяршэнне работ па правядзенні водаправода. Трэба адзначыць, што на суседніх вуліцах ён быў пракладзены яшчэ ў 2010—2012 гадах за грошы дзяржбюджэту. Канчатковае вырашэнне праблемы застаецца на кантролі ў аблвыканкаме.

Мазыранка Марыя Кірынская прасіла дапамагчы вырашыць жыллёвую спрэчку са сваякамі. Падрабязна ў праблеме разбіраўся старшыня Мазырскага райвыканкама Яўген Адаменка. Дачок жанчыны сабралі разам і змаглі прыйсці да паразумення. На сустрэчу запрасілі натарыуса і правялі ўсе здзелкі па падзеле іх маёмасці.

Надзея Прыгара з гарадскога пасёлка Лоеў папрасіла завяршыць рамонт у жаночым аддзяленні мясцовай лазні. Праз тыдзень пасля правядзення прамой тэлефоннай лініі ў лазні памянялі кацёл, і цяпер яна прымае наведвальніц.

На «прамую лінію» з удзелам губернатара патэлефанаваў кіраўнік гомельскага прадпрыемства «Святлатэхніка», якое працаўладкоўвае людзей з праблемамі зроку. Ён прасіў аказаць фінансавую дапамогу. Губернатар асабіста пабываў на прадпрыемстве 26 студзеня і даў даручэнні глыбока разабрацца ў эканамічнай сітуацыі. Уладзімір Дворнік адзначыў, што канкурэнтаздольнасць «Святлатэхнікі» неабходна павялічваць, паменшыўшы сабекошт прадукцыі. Спецыялісты павінны сур'ёзна папрацаваць над зніжэннем выдаткаў, што дазволіць больш дзейсна ўдзельнічаць у тэндарах. Да таго ж ідзе размова аб асвойванні новага віда прадукцыі — газавых лічыльнікаў.

БОЛЬШАСЦЬ ПРЭТЭНЗІЙ — ДА КАМУНАЛЬНІКАЎ

На «прамую лінію» з удзелам **старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміра ДАМАНЕЎСКАГА** 17 студзеня патэлефанавала 35 чалавек. Па ўсіх гэтых зваротах меры ўжо прынятыя.

— У той жа дзень ліквідавалі недапрацоўкі, звязаныя з рамонтам дахаў двух магілёўскіх шматпавярховікаў, — паведаміла **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Магілёўскага аблвыканкама Іна ФІЛІПАВА**. — Цяпер адсочваем якасць зробленых работ, паколькі праводзіліся яны ў не зусім спрыяльных умовах. Што датычыцца заяўніцы са Слаўгарада, якая таксама скардзілася на праблемы з дахам, ёй растлумачылі: капрамонт пачнецца, як толькі гэтаму будзе спрыяць надвор'е. Праектна-каштарысная дакументацыя і неабходныя будаўнічыя матэрыялы для гэтага ўжо падрыхтаваны.

Пафарбавалі першую і апошнюю прыступкі лесвічных маршаў у доме па вуліцы Першамайскай, дзе жыве інвалід па зроку. Праблема ўзнікла з-за непаразумення паміж жыхаркай гэтага дома і супрацоўнікамі ЖЭУ, якое яго абслугоўвае. Губернатар даручыў прывесці ў адпаведнасць з існуючымі нормамі прыступкі і ў іншых дамах, дзе жывуць інваліды па зроку.

Пенсіянерцы з Магілёва, якая паскардзілася на тое, што не можа ніяк трапіць на прыём да анколага, пасадзейнічалі ў правядзенні медыцынскага абследавання. Вырашыліся пытанні па разліках з былым супрацоўнікам шклозавода «Ялізава» з Асіповіцкага раёна.

У асноўным пытанні вырашаліся на карысць заяўнікаў, але не ўсе з іх атрымалі здавальняючыя адказы. Жанчыне, у сям'і якой выхоўваецца дзіця-інвалід, растлумачылі, што атрымаць сацыяльнае жыллё ў Магілёве яна можа толькі па чарзе. У спісках грамадзян, якія маюць патрэбу ў такім жыллі, яна значыцца 835-й. Улічваючы, што летась па вобласці было ўведзена ў строй 175 такіх памяшканняў, з якіх у Магілёве толькі 34, яе кватэрнае пытанне вырашыцца не так хутка. Жанчыне таксама растлумачылі парадак будаўніцтва жылля з выкарыстаннем ільготнага крэдыту.

Правялі праверку ацэначнага кошту жылля па заяве жыхаркі з глускай вёскі Заеліца. Жанчына скардзілася на завышаны кошт. Але яе падазрэнні не пацвердзіліся. 17 студзеня падзяліцца набалелым змаглі 378 грамадзян, 90 з іх мелі размову непасрэдна з губернатарам і яго намеснікамі.

Усе звароты, якія паступілі на «прамыя лініі», знаходзяцца на асаблівым кантролі, запэўнілі ў аблвыканкаме. Па тых, якія патрабуюць дадатковых фінансавых сродкаў ці арганізатарскіх рашэнняў, грамадзянам далі неабходныя тлумачэнні. Дарэчы, большасць пытанняў датычыцца менавіта камунальных праблем. А па колькасці зваротаў у лідарах — жыхары Магілёва.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Ірына АСТАШКЕВІЧ,
Нэлі ЗІГУЛЯ

«Звязда» будзе і далей сачыць за тым, як выконваюцца даручэнні, дадзеныя падчас прамых тэлефонных ліній.

■

■ Прыватная арэнда

ДАРАГАЯ ВАЛЮТА «ПАДРЭЗАЛА» АПЕТЫТЫ ГАСПАДАРОЎ

Эксперты сталічнага рынку арэнды прагназуюць далейшае зніжэнне цэннікаў і ў лютым

Прыватны рынак сталічнай жыллёвай арэнды пачынаў «перагравацца» павышанай прапановай яшчэ летась у кастрычніку-лістападзе. Адначасова тады пачалося зніжэнне коштаў жылля на другасным рынку. У той час, калі нерухомасць таннее, частка ўладальнікаў свабодных памяшканняў вырашае не прадаваць свае кватэры, а выстаўляе іх пад доўгатэрміновую арэнду. Патэнцыяльных кліентаў за гэты час больш не стала, таму памер варыянтаў арэнднага жылля працягваў толькі павялічвацца. Цэны зніжаліся, але неяк пасіўна. Практычна дзве дэкады снежня актыўнасць на рынку набліжалася да нуля... Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на бліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла галоўны спецыяліст па аперацыях з нерухомасцю Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Алена АГРЫЗКА.

ПРАПАНОВА НА МАКСІМУМЕ

Пасля вядомага «кульбіта» з курсам замежнай валюты рынак у апошні тыдзень мінулага года ўвогуле амаль стаў. Уладальнікі арэнднага жылля яшчэ не падкарэкціравалі свае цэннікі, а вось будучыя кватаранты ўжо не згаджаліся плаціць за кватэры значна большыя сумы. Таму на працягу амаль паловы студзеня попыт з прапановай шукалі нейкую залатую сярэдзіну. Такая прыцірка інтарэсаў гаспадароў жылля і іх патэнцыяльных кліентаў працягваецца і цяпер.

За апошні месяц амаль не павялічылася колькасць прапановы па трохпакаёвых кватэрах.

Зразумела, што звычайна на прыватным рынку арэнды разлікі ажыццяўляюцца ў валюце. А вось рублёвыя заробкі ў кватарантаў за мінулы месяц не павялічыліся. Таму кватэраздатчыкі былі вымушаны памяншаць свае апетыты і зніжаць цэннікі ў доларах або нават згаджацца на аплату нацыянальнымі грашыма. Праўда, такімі адэкватнымі стратэгамі былі адразу далёка не ўсе ўладальнікі арэндных памяшканняў. Істотная частка гаспадароў падобнага жылля і сёння працягвае трымаць леташнія цэны. Таму з другой паловы студзеня ў сталіцы пачалося даволі актыўнае перасяленне небагатых кватарантаў у больш таннае свабоднае жыллё, якога сёння на рынку хапае.

БЮДЖЭТНАЯ АДНАПАКАЁЎКА — УЖО КАЛЯ 300 ДОЛАРАЎ

Эксперт адзначае, што ў апошні тыдзень студзеня на сталічным рынку пачалі з'яўляцца аднапакаёвыя кватэры з мінімальным цэннікам ад 250 да 300 долараў. Вядома, што гэта кватэры эканом-класа, якія звычайна размешчаны ў старых пяціпавярховых дамах і маюць невысокі ўзровень камфортнасці (стандартны набор недарагой мэблі, пасрэдны рамонт і айчынная бытавая тэхніка). Калі памяшканні за 250 долараў сустракаюцца рэдка, то за 300 існуе нават сякі-такі выбар.

Самая вялікая колькасць прапановы адпавядае аднапакаёваму жыллю з цэннікам ад 350 да 400 долараў. Жыллё такога рангу цяпер мае даволі якасны рамонт, сучасную кухню, пральную машыну, добры халадзільнік і тэлевізар. Прапанова падобнага жылля павялічваецца і цяпер. Вышэй названае агенцтва атрымлівае за дзень некалькі дзясяткаў новых варыянтаў прапаноў аднапакаёвак з цэннікам ад 280 да 400 долараў.

ПАТАННЕЛІ І ДВУХПАКАЁЎКІ

Апошнія некалькі тыдняў на рынак арэнды ўсё часцей пачалі «выкідваць» сапраўды танныя двухпакаёвыя кватэры ў дыяпазоне ад 330 да 350 долараў. Такое жыллё размешчана ў загазаваных мікрараёнах, мае невялікую плошчу і мінімальны набор мэблі і тэхнікі. Двухпакаёўкі сярэдняй якасці ў старых спальных раёнах, а часам і ў новых дамах, цяпер можна адшукаць па кошце 400-450 долараў, але хапае прапаноў і за 500. Не вельмі сур'ёзна знізіўся кошт на сапраўды якасныя двухпакаёвыя кватэры, дзе прысутнічае індывідуальны дызайн разам з еўрарамонтам, імпартная бытавая тэхніка і дарагая мэбля. Кошт доўгатэрміновай арэнды такіх памяшканняў складае ад 600 да 1000 долараў.

Апошнія змены амаль не зачапілі элітныя двухпакаёвыя суперкватэры. Колькасць іх на рынку абмежавана, і каштуюць яны ў межах ад 1,5 да 2 тысяч долараў.

За апошні месяц амаль не павялічылася колькасць прапановы па трохпакаёвых кватэрах. Справа ў тым, што падобнае жыллё ў Мінску сёння часта здымаюць па прынцыпе кампаньёнства, калі жывуць там сябры (сяброўкі), незнаёмыя і калегі ці нават асобныя сем'і. У гэтым выпадку гаспадары такіх кватэр лягчэй згаджаюцца на часовыя зніжкі, бо адшукаць іншую беспраблемную кампанію кватарантаў не так і проста.

А сярод новых прапаноў на рынку часам з'яўляюцца і зусім танныя. Сціплыя па камфорце і маленькія па плошчы трохпакаёўкі ў Заводскім раёне і Шабанах магчыма адшукаць цяпер за 350-400 долараў. Жыллё па такім кошце будзе абавязкова на крайніх паверхах старых пяціпавярховых домаў. Раней яно здавалася даражэй, але кватаранты з'ехалі. Цяпер гаспадары падобных слабенькіх кватэр пачалі больш адэкватна ставіцца да сітуацыі. Таму, каб стаць больш канкурэнтаздольнымі на раздутым рынку, гаспадары і прапануюць падобныя зніжкі. Увогуле, мінімальны дыяпазон узроўню арэнды трохпакаёвых кватэр у розных мікрараёнах складае ад 370 да 450 долараў.

У бліжэйшыя 1-2 месяцы цэннікі на доўгатэрміновую арэнду будуць толькі памяншацца.

А стандартныя трохпакаёўкі з адпаведным наборам нядрэннай мэблі і тэхнікі, а таксама кватэры, падрыхтаваныя для арэнды, каштуюць ужо ад 600 да 1000 долараў.

ПОПЫТ «СХАВАЎСЯ» Ў ІНТЭРНЭТ

Алена Агрызка адзначае, што толькі за апошні месяц аб'ём прапановы на рынку павялічыўся ў 2-2,5 раза. Гэта азначае тое, што ў сталіцы скарацілася колькасць работнікаў з сур'ёзнымі заробкамі, якія прыбылі сюды з рэгіёнаў. Акрамя таго, спецыяліст тлумачыць гэта і тым, што ў патэнцыяльных кліентаў банальна не хапае грошай на здымнае жыллё і аплату паслуг агенцтваў. Людзі працягваюць шукаць танныя кватэры самастойна праз інтэрнэт, па аб'явах і знаёмых. А рэальна ацаніць падобны попыт даволі складана.

Пасля прагляду шэрагу розных форумаў у сеціве журналіст газеты адшукаў мноства аб'яў ад патэнцыяльных кватарантаў, якія жадаюць здымаць якаснае жыллё амаль за капейкі. Побач былі і аб'явы ад тых, каму кватэры былі патрэбны сапраўды тэрмінова. Адрозненні былі сур'ёзнымі: ад 50 да 150 долараў. У гэтым выпадку наш эксперт раіць не гнацца за «катом у мяшку». Бо нельга выключыць, што праз слабыя «кропкі» новага віртуальнага пошуку ў арэндную сферу прасочыцца і элемент махлярства.

АРЭНДА ДАКЛАДНА БУДЗЕ ТАННЕЦЬ І НАДАЛЕЙ

Алена Агрызка ўпэўнена, што ў бліжэйшыя 1-2 месяцы цэннікі на доўгатэрміновую арэнду будуць толькі памяншацца. Без кардынальнага павелічэння масавага попыту сітуацыя не зменіцца. А патэнцыяльныя кватаранты цяпер узялі часовы тайм-аўт. Таму кватэры за гэты час могуць яшчэ патаннець прыкладна на 10%. У першую чаргу патанненне закране не зусім слабенькія кватэры, дзе цэннік ужо амаль мінімальны, а тое жыллё, па якім гаспадары на зніжкі яшчэ не згадзіліся.

МАГЧЫМА І ЗВУЖЭННЕ ПРАПАНОВЫ

У бліжэйшы месяц на рынак прапановы можа паўплываць і агучаная навіна аб больш жорсткім пакаранні ўладальнікаў «сацыяльных» кватэр, якія цішком здаюць такое жыллё. Тут маюцца на ўвазе кватэры, пабудаваныя з выкарыстаннем ільготных крэдытаў, на якія існуе забарона па здачы ў арэнду да поўнага пагашэння запазычанасці па крэдыце. У лютым гаспадары гэтых кватэр могуць атрымаць за свае хітрыкі штраф ужо ў памеры ад 720 тысяч да 5,4 млн рублёў. А паўторная здача ў арэнду на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання павялічвае гэтыя штрафы да сумы ад 5 да 9 млн рублёў.

Кватэраздатчыкі былі вымушаны памяншаць свае апетыты і зніжаць цэннікі ў доларах або нават згаджацца на аплату нацыянальнымі грашыма.

Гаворка пра падобную перспектыву вялася ўжо даўно. Потым была прапанова ад грамадскасці, а цяпер ёсць і даволі рэальны дакумент, які хутка пачне дзейнічаць. Таму асобныя аналітыкі ад жыллёвай арэнды прагназуюць наступнае развіццё падзей. Адразу пасля рэальных штрафаў падобныя кватэры імгненна знікнуць з рынку. Як гэта адаб'ецца на далейшым развіцці парытэту попыту і прапановы, казаць пакуль зарана. Нават спецыялісты дакладна не ведаюць колькасць такога жылля на рынку арэнды.

Сяргей КУРКАЧ

■

Дарэчы

Сталіца павялічыла падаткі за арэнду жылля і гаражоў

Такім чынам, з першых дзён лютага ў Мінску змяняюцца стаўкі падатку за здачу прыватнага жылля і гаражоў у арэнду. Пра гэта гаворыцца ў адпаведным рашэнні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў ад 22 снежня 2014 года №81, якое было апублікавана ўчора на Нацыянальным прававым партале.

Новыя памеры ставак падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах тычацца даходаў ад нерухомасці, што былі атрыманы ўласнікамі маёмасці ад здачы фізічным асобам у арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых і (або) нежылых памяшканняў, а таксама машына-месцаў.

Гэтыя стаўкі ўстаноўлены ў залежнасці ад эканоміка-планіровачнай зоны, у якой знаходзіцца такое жылое памяшканне. Цяпер стаўка падатку на жылыя памяшканні (за кожны асобны пакой), садовыя домікі і дачы ў першай эканоміка-планіровачнай зоне складзе 240 тысяч рублёў у месяц, у другой — 200 тысяч, у трэцяй і чацвёртай — 170 тысяч, у пятай — 140 тысяч рублёў. Нагадаю, што раней за здачу жылых памяшканняў у першай эканоміка-планіровачнай зоне трэба было заплаціць фіксаваны падатак у памеры 200 тысяч рублёў у месяц за кожны жылы пакой. Адпаведна, у другой зоне — 170 тысяч, у трэцяй і чацвёртай — 140 тысяч, а ў пятай — 120 тысяч рублёў. За здачу металічных або драўляных гаражоў, машына-месцаў цяпер трэба будзе заплаціць ад 50 да 80 тысяч рублёў, за здачу жалезабетонных або цагляных гаражоў — ад 90 да 100 тысяч рублёў у залежнасці ад эканоміка-планіровачнай зоны. Да іншых нежылых памяшканняў прымяняецца стаўка падатку ад 20 да 40 тысяч рублёў за 1 квадратны метр плошчы.

Спецыялісты Мінгарвыканкама асобна адзначаюць, што названыя стаўкі не прымяняюцца ў адносінах да даходаў, што атрыманы ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці або ад індывідуальных прадпрымальнікаў у выніку арэнды (субарэнды), найму (паднайму) жылых і (або) нежылых памяшканняў, машына-месцаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі краіны.

Акрамя гэтага, **уладальнікі свабодных метраў павінны помніць, што такія памеры фіксаваных ставак прымяняюцца толькі тады, калі ў падатковым перыядзе даход ад здачы памяшканняў не перавысіў 43 млн 660 тысяч рублёў**. А вось пры больш сур'ёзным даходзе ад гэтай дзейнасці гаспадары нерухомасці павінны будуць заплаціць ужо падаходны падатак у памеры 13% ад атрыманай выручкі пасля падачы падатковай дэкларацыі па выніках года.

РЫХТУЙЦЕ «САЦЫЯЛЬНЫЯ» ПЫТАННІ

7 лютага з 10.30 да 12.00 Міністэрства працы і сацыяльнай абароны праводзіць агульнарэспубліканскую прамую тэлефонную лінію

Каб аператыўна адрэагаваць на пытанні, што хвалююць людзей, і аказаць ім кваліфікаваную прававую дапамогу, удзел у гэтай шырокамаштабнай акцыі прымуць усе ўзроўні ведамства — ад міністэрства да раённых і гарадскіх упраўленняў.

Звярнуцца да міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны Акіндзінаўны ШЧОТКІНАЙ можна будзе па тэлефоне **306-37-95.**

На пытанні сацыяльна-працоўнай сферы будуць таксама адказваць дырэктар Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Анатоль Пятровіч САДОЎНІЧЫ (нумар — 306-41-00) і кіраўнік Фонда сацыяльнай абароны насельніцтва Людміла Цімафееўна БАЧЫЛА (286-05-81).

Прапановы і праблемы грамадзян выслухаюць і старшыні камітэтаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкамаў: у Брэсцкай вобласці — Міхаіл Сцяпанавіч АКСЯНЕВІЧ (8-0162-21-26-61), у Віцебскай — Аляксандр Мікалаевіч ХРЫСТАФОРАЎ (8-0212-47-40-53), у Гомельскай — Пётр Мікалаевіч САВІЦКІ (8-0232-74-41-81), у Гродзенскай — Анатоль Казіміравіч ЗІМНАВОДА (8-0152-77-29-46), у Магілёўскай — Святлана Пятроўна ТАРАСЕНКА (8-0222-32-67-42), у Мінскай — Алег Аляксеевіч СЕМЯНЧУК (204-10-03).

На пытанні жыхароў сталіцы адкажа старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна Аляксандраўна РАМАНОВІЧ (223-70-95).

Пра нумары астатніх удзельнікаў «прамой лініі» можна даведацца на сайце міністэрства **www.mintrud.gov.by** і на інтэрнэт-старонках мясцовых камітэтаў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ,

опубликованной 25 февраля 2014 г. в газете «Звязда»,
по объекту Многоквартирный жилой дом не повышенной комфортности № 3 по генплану с помещениями общественного назначения, подземной автостоянкой в квартале улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко, П.Глебки (продолжение) в г. Минске.

Общество с ограниченной ответственностью «Антасам» информирует о дополнении к проектной декларации объекта долевого строительства, опубликованной в газете «ЗВЯЗДА» № 35 от 25 февраля 2014 г.:

Внести следующие дополнения:

Абзац «Для привлечения физических, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагаются:» **дополнить:**

5 (Пять) машино-мест в подземной гараж-стоянке. Цена 1 машино-места общей площади помещений общественного назначения в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации составляет 285 825 000 (Двести восемьдесят пять миллионов восемьсот двадцать пять тысяч) белорусских рублей, эквивалентной 18 500 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 03 февраля 2015 г. УНП 100727641

Извещение ОАО «Белэнергозащита», опубликованное 3.02.2015 г. № 20, читать: годовое собрание акционеров состоится 20.03.2015 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 12. УНП 100098854

ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ОАО «Минский домостроительный комбинат»,

опубликованной в газете «Минский курьер» 20.08.2014 г. № 94
на строительство объекта: «16-этажный жилой дом по генплану № 12 в микрорайоне № 2 в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева»

Для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются 3-комнатные квартиры – 6 шт., общей площадью 78,05 м^2.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства на день опубликования проектной декларации в текущих ценах с учетом прогнозных индексов в нормативный период строительства без отделочных работ **для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий,** составляет: 14 645 564 рубля.

Регистрация заявлений для заключения договоров долевого строительства будет производиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 через пять календарных дней после выхода проектной декларации, с «09» февраля 2015 г. При себе необходимо иметь паспорт, справку о нуждаемости в улучшении жилищных условий со сверкой данных.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (отдел инвестиций), тел. 017 2072060, 044 7771158; Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: понедельник – четверг 8.30–16.30, пятница 8.30–15.00. УНП 100258980

09 марта 2015 г. в 10.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна №1».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2014 год и основные направления деятельности общества в 2015 г.
2. Отчет совета директоров общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2014 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2014 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2015 году и первом квартале 2016 г.
6. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизора общества.
7. Избрание членов совета директоров и ревизора.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Время регистрации в день проведения собрания с 09.30. до 10.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 02.03.2015 г. (с 14.00 до 16.00), по месту нахождения общества.

Совет директоров

УНН 200215539

■ Каб помнілі...

Я ПРЫНЁС ВАМ ДАР

Канцэрт у дзень нараджэння Уладзіміра Мулявіна — традыцыйны праект Беларускай дзяржаўнай філармоніі і Музея У. Мулявіна — адбыўся ў Мінску

Вось ужо некалькі гадоў запар ён ладзіцца з удзелам флагмана айчыннага музычнага мастацтва — Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя Жыновіча пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Казінца.

Сёлета падарункам на дзень нараджэння Уладзіміру Мулявіну стаў сольны канцэрт Пятра Ялфімава, які спяваў у суправаджэнні аркестра Жыновіча. Імёны вялікага песняра Уладзіміра Мулявіна і харызматычнага маладога спевака Пятра Ялфімава ў той вечар скрыжаваліся цалкам невыпадкова. Бо сёння няма, бадай, найлепшага выканаўцы песняроўскіх хітоў. Складаныя, адмысловыя, ювелірна адточаныя майстэрскай рукой Уладзіміра Мулявіна, найлепшыя песні «Песняроў», як паказвае час, паддаюцца толькі сапраўдным майстрам эстраднага вакалу. Ялфімаў, без перабольшання, — першы сярод іх. Яго імя, як і ні з чым не параўнальны голас, выклікаюць вялізную цікавасць шматлікіх слухачоў далёка за межамі Беларусі. Аншлаг у канцэртнай зале філармоніі — чарговае пацвярджэнне каласальнай папулярнасці Ялфімава, які не падмануў чаканні сваіх паклоннікаў і сумленна адпрацаваў вялікі сольны канцэрт у 2 адзяленнях, «ужывую» выканаўшы каля 20 песняроўскіх шлягераў. У іх ліку — «Александрына», «Мой родны кут», «Вераніка», «Зачараваная», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Будачнік», «Завушніцы», «Алеся», «Чырвоная ружа» і шмат іншых «залатых хітоў» Уладзіміра Мулявіна, Ігара Лучанка і іншых кампазітараў, да творчасці якіх у свой час далучаліся «Песняры». Некаторыя з гэтых твораў Пётр Ялфімаў развучыў спецыяльна да свайго сольнага канцэрта і выканаў упершыню. Сенсацыяй вечара было выкананне кампазіцыі Уладзіміра Мулявіна «Я не паэта» на верш Янкі Купалы, якую артыст праспяваў упершыню пасля таго, як яна была створана і выканана Уладзімірам Мулявіным у праграме 1982 года «Я нясу вам дар» паводле паэзіі Янкі Купалы. Найскладанейшая і найпрыгажэйшая, гэта песня была адкрыта наноў. Яе віртуознае, сапраўды магутнае выкананне ў самым пачатку стала эпіграфам да канцэрта і адначасова — музычным падарункам Уладзіміру Мулявіну і ўсёй яго творчай спадчыне.

Дзве з паловай гадзіны Пётр Ялфімаў трымаў публіку ў палоне свайго незвычайнага вакалу, што ўзмацнялі бліскучыя аркестравыя аранжыроўкі заслужанага артыста Беларусі Аляксандра Крамко (у той вечар ён іграў на сола-гітары), а таксама спевы бэк-вакалістаў Аляксандра Ляпунова, Уладзіслава Даніловіча і Паўла Бяркова, якіх спявак запрасіў да ўдзелу ў сваім сольным канцэрце. Многіх здзівіла, захапіла і парадавала тое, што Пётр Ялфімаў нечакана сам стаў на бэк-вакал, калі песню «Калядачкі» заспяваў малады саліст аркестра імя Жыновіча Андрэй Коласаў. Падобны ўчынак, калі майстар рангу Ялфімава становіцца «на падпеўкі» да артыста-пачаткоўца, не толькі адпаведным чынам характарызуе яго, але зноў-такі выклікае пэўныя алюзіі з самім Уладзімірам Мулявіным, які таксама не цураўся спяваць у хоры падчас саліравання Барткевіча, Кашапарава, Дайнекі ці Пені. Гэта, калі хочаце, прыкмета творчай і чалавечай мудрасці, разумення таго, што ў творчасці няма другарадных дэталяў, але важна ўсё, пры гэтым галоўнае — мастацкі вынік, перад якім роўныя і «салдаты», і «генералы».

Супрацоўніцтва Пятра Ялфімава і Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Казінца доўжыцца ўжо восьмы сезон. І кожны іх сумесны праект робіцца вялікай падзеяй. Так было і на гэты раз. Не будзе перабольшаннем сцвярджэнне, што сёння Ялфімаў і аркестр імя Жыновіча дасягнулі самых значных вынікаў ва ўвасабленні і аднаўленні творчай спадчыны «Песняроў». У сезонах 2011-2012 гадоў аркестр імя Жыновіча пры ўдзеле Пятра Ялфімава аднавіў рок-паэму «Гусляр» і рок-оперу «Песня пра долю» — дзве самыя яркія і адметныя праграмы ансамбля, якія лічацца вяршыняй творчасці «Песняроў» і Уладзіміра Мулявіна. І вось узята новая творчая вяршыня, што чарговы раз пацвердзіла ўнікальнасць Пятра Ялфімава як спевака і ўніверсальнасць аркестра імя Жыновіча як калектыву, якому падуладна незвычайнае спалучэнне стыхіі року і фальклору — такі кірунак, якога трымаўся ў сваёй дзейнасці Уладзімір Мулявін. Напэўна, выдатны музыкант быў бы задаволены тым, як беражліва і надзейна ўтрымліваецца сёння тое найлепшае, што ён рупліва назапасіў амаль за 40 гадоў творчай дзейнасці, і з радасцю прыняў бы шчыры падарунак, які падрыхтавалі яму на дзень нараджэння яго таленавітыя калегі.

Вольга БРЫЛОН

«СТУДЭНТ ГОДА» — КРЭАТЫЙНЫ ЮРЫСТ

ВУСНАМІ ДЗІЦЯЦІ...

Ролікі ўсіх фіналістаў былі выкладзены на сайце БРСМ для правядзення анлайн-галасавання загадзя і сталі фактычна візітнай карткай, па якой можна было скласці першае ўражанне пра аўтараў. Але як зачапіць увагу прыдзірлівага журы і балельшчыкаў?

Студэнт 4 курса лячэбнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Андрэй САВОСЦІН вырашыў праспяваць гумарыстычную песню аб «простым студэнце»: «Я завуся Андрушам, са мной здаралася многае...» Пра **Аляксандра ГАЙВАРОНСКАГА, курсанта 4 курса ваенна-тэхнічнага факультэта БНТУ**, у кліпе расказваюць яго сябры, якія параўноўваюць Сашу з ільвом, гепардам, сабакам, мядзведзем, пугачом, лемурам і нават жырафам. А **Ганна МЯДЗЕЛЕЦ, студэнтка 3 курса эканамічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта**, вырашыла пацікавіцца тым, як будзе праходзіць конкурс у 2030 годзе ў... будучых студэнтаў, якія пакуль яшчэ ходзяць у дзіцячы садок. «Хто такі студэнт і чым ён займаецца?» — запыталася дзяўчына ў малых.

«Мяркую, што гэта прэзідэнт»; «Прыгожы такі, у іх там памады ўсялякія і цені»; «Ён лечыць сабачак і коцікаў, а яшчэ чарапах»; «Той, хто вучыцца ў класе»; «Робіць усялякія прычоскі, прышпільвае розныя заколачкі», — радасна адказала дзятва.

«У СТРАІ АНЛАЙН»

Фінал рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года» складаўся сёлета з двух этапаў. У першы дзень студэнты прэзентавалі свае аўтарскія маладзёжныя праекты, якія будуць рэалізаваны цягам года, і ўдзельнічалі ў конкурсе прамоўніцкага майстэрства «Мая спецыяльнасць — мая гарантыя будучыні».

Пяцікурсніца факультэта эканомікі і права Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра МАЛАКАНАВА прапанавала ў год прэзідэнцкіх выбараў інтэрактыўную гульню-стратэгію «Зрабі правільны выбар». Гульня ўключае 5 узроўняў і 25 этапаў. Як у сапраўднай гульні-стратэгіі, кожны сам пракладвае свой шлях да галоўнага прыза. Напрыклад, на чацвёртым узроўні ўдзельнік павінен будзе размясціць на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы агітацыйны постар і максімальна распаўсюдзіць яго на старонках віртуальных сяброў. А на апошнім, пятым узроўні, калі ўдзельнік гульні выканае свой грамадзянскі абавязак і прагаласуе на выбарчым участку, яго задача — размясціць на сацыяльнай старонцы сэлфі з хэштэгам «Я зрабіў свой выбар!» на фоне графіка работы выбарчага ўчастка.

Сутнасць праекта Ганны Мядзелец «У страі анлайн» заключаецца ў выкарыстанні сучасных тэхналогій для таго, каб аб'яднаць мінулае і будучыню.

— Ветэраны і сёння ў страі, аднак з кожным годам іх сувязі з навакольным светам становяцца ўсё менш трывалымі. Мы, студэнты-валанцёры, дапамагаем ім вырашаць не толькі бытавыя пытанні, але і мець зносіны са сваімі блізкімі, сябрамі і аднапалчанамі дзякуючы электроннай пошце, відэамеседжарам і сацыяльным сеткам, — расказала дзяўчына. — Гэты праект вельмі важны і для сувязі паміж пакаленнямі, таму што пры дапамозе відэаканферэнцсувязі ў рэальным часе ветэраны вайны расказваюць моладзі пра падзеі 70-гадовай даўнасці.

Аляксей КУТАФІН, курсант 3 курса ваеннага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, выступіў з ініцыятывай у год юбілею Вялікай Перамогі падрыхтаваць відэафільм-віншаванне. «Няхай моладзь з кожнага рэгіёна прачытае верш патрыятычнай тэматыкі ля помніка героям Вялікай Айчыннай вайны і дашле нам свой відэасюжэт. На падставе ўсіх дасланых відэасюжэтаў будзе створаны фільм «Радкі памяці», — патлумачыў Аляксей.

Дарэчы, моладзь Гродзеншчыны ўжо падрыхтавала свой фільм, які быў прадэманстраваны ў фінале конкурсу «Студэнт года».

— У размове з начальнікам Цэнтра культуры БНТУ Інай Туманавай я даведаўся, што вёска Луніца Чэрвеньскага раёна паўтарыла лёс Хатыні. Летам 1944 года пры адступленні фашысты падпалілі вёску разам з людзьмі. Бабуля і дзядуля Іны Аляксандраўны, якім пашчасціла выратавацца з пекла, прыгадавалі, што зямля гарэла пад нагамі тры дні. Але гэтай вёскі няма ў спісе спаленых вёсак Беларусі. Штогод усплываюць новыя факты, падзеі і імёны, таму нам, маладым і неабыякавым, нельга пакідаць іх без увагі.

Праект **Віктара КУРАША, курсанта 4 курса факультэта міліцыі Магілёўскага інстытута МУС**, заключаецца ў пошуку герояў барацьбы са злачыннасцю на тэрыторыі Беларусі.

— Пра дзейнасць беларускай міліцыі ў перадваенныя гады мала вядома, усё яшчэ застаецца шмат «белых плям». Работа, праведзеная курсантамі ў архівах, ужо прынесла свой плён: вызначаны імёны трох супрацоўнікаў міліцыі, якія загінулі ў 20-я гады XX стагоддзя. Высветлены абставіны, дата і месца гібелі яшчэ 14 супрацоўнікаў міліцыі... Пасля завяршэння праекта плануецца падрыхтоўка да друку выдання пра невядомыя факты з гісторыі беларускай міліцыі, а таксама падрыхтоўка дакументальных фільмаў пра кожнага з герояў, якія загінулі пры выкананні службовага абавязку, — патлумачыў хлопец.

МОЙ ГЕРОЙ

Што цікава: чацвёра з васьмі фіналістаў сёлетняга конкурсу «Студэнт года» — гэта, так бы мовіць, людзі ў пагонах: будучыя ваенныя, прадстаўнікі праваахоўных органаў і выратавальнікі.

Трэба сказаць, што ў год святкавання 70-годдзя Вялікай Перамогі ваенная тэма гучала рэфрэнам усяго мерапрыемства. Так, падчас конкурсу «Мой герой Перамогі» задачай удзельнікаў было расказаць у любым жанры пра чалавека, які з'яўляецца для іх прыкладам мужнасці і адвагі. Аляксандра Малаканава паказала інсцэніроўку апошняга дня жыцця адважнай лётчыцы Кацярыны Зелянко. Гэта адзіная ў свеце жанчына, якая прымяніла паветраны таран, і за праяўленыя ў баі мужнасць і гераізм была пасмяротна ўганаравана званнем Героя Савецкага Саюза.

Аляксей Кутафін у невялічкім спектаклі расказаў на сцэне жыццёвую гісторыю ганаровага грамадзяніна горада Гродна Івана Данілавіча Лебедзева — шлях ад маладога агранома да героя Вялікай Айчыннай вайны, удзельніка баёў на Дняпры, Героя Савецкага Саюза.

Для Ганны Мядзелец такім героем стала народная артыстка СССР Клаўдзія Шульжэнка, якая ў 1941 годзе добраахвотна ўступіла ў дзеючую армію і ўсе чатыры гады выступала перад байцамі на аэрадромах, чыгуначных платформах, у заводскіх цэхах, у палатках ці проста на лёдзе. Дала больш як 500 канцэртаў у блакадным Ленінградзе.

А Віктар Кураш распавёў пра ўдзельніка партызанскага руху Уладзіміра Данілавіча Кадзіна. Калі распачалася вайна, хлопцу было ўсяго 17 гадоў. Ён пайшоў у партызаны. Трапіў у канцэнтрацыйны лагер, адкуль з групай таварышаў яму ўдалося ўцячы. У 1943 годзе паступіў загад — не прапусціць немцаў у партызанскую зону. І тры дзясяткі партызанаў стрымлівалі націск васьмі сотняў немцаў і паліцаяў да прыходу асноўных сіл. За гэты бой юнак атрымаў сваю першую баявую ўзнагароду, самую для яго дарагую, хоць пазней былі і іншыя ўзнагароды...

Момант конкурсу.

Фота bsm.by

Аляксандра МАЛАКАНАВА разам са сваёй маці — актыўнай удзельніцай групы падтрымкі.

ВЫДАТНІЦА І АКТЫВІСТКА

Апошні творчы конкурс «Маладая Беларусь», у якім канкурсанты спявалі і танцавалі, паставіў кропку ў конкурсных выпрабаваннях. Паўгадзінная паўза — і, нарэшце, былі аб'яўлены прызёры і новы ўладальнік тытула «Студэнт года». Трэцяе месца падзялілі паміж сабой Віктар Кураш (Магілёўскі інстытут МУС) і Аляксей Кутафін (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы). Другое месца дасталася студэнту Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Андрэю Савосціну. А абсалютным пераможцам стала студэнтка Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра Малаканава.

Стварэнне адзінага рэспубліканскага партала «Памяць» з нанясеннем на карту ўсіх пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку малавядомых або ўвогуле невядомых, ініцыяваў Аляксандр Гайваронскі.

Аляксандра скончыла сярэднюю школу №9 у Лідзе. З'яўляецца дыпламантка міжнародных навукова-практычных канферэнцый, прызёрам юрыдычных і паліталагічных алімпіяд, удзельніцай творчага харэаграфічнага калектыву «Імпрэза», актывісткай першаснай арганізацыі БРСМ Баранавіцкага ўніверсітэта. Сярэдні бал за ўвесь час навучання — 9,0.

Аляксандра будучы юрыст. З'яўляючыся выдатніцай, дзяўчына паспяхова сумяшчае сваю вучобу з працай (прызналася, што ўжо працуе на палову стаўкі ў банку). Смяецца: «Вось такі перад вамі незвычайны крэатыўны юрыст». Услед за ёй у Баранавічы перабралася і яе сям'я. Дарэчы, маці была адным з самых актыўных удзельнікаў групы падтрымкі Аляксандры ў фінале.

На пытанне журналіста «Звязды» «Якое тваё самае вялікае жаданне пасля перамогі?» быў адказ: «Адпачыць... Творчыя нумары да фіналу рыхтаваліся цягам двух месяцаў. Асабліва напружаныя былі апошнія тры дні. Нікога з удзельнікаў фіналу я не лічу сваімі сапернікамі. Усе хлопцы і дзяўчаты выступалі вельмі годна. І мне было вельмі прыемна выступаць з імі на адной сцэне».

Надзея НІКАЛАЕВА,
Мінск—Горкі—Мінск.

■ Запрашальнік

На «Каменную казку» — пяцідзясяты раз

Мінералагічная выстава-кірмаш «Каменная казка» аднаўляе сваю экспазіцыйную дзейнасць у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Між іншым, гэты сезон стане для яе юбілейным — пяцідзясятым.

Урачыстае адкрыццё выставы адбудзецца 24 лютага ў галоўным корпусе (праспект Незалежнасці, 4). Юбілейная праграма «Каменнай казкі» вельмі насычаная і ўключае шмат асветніцкіх мерапрыемстваў. Наведвальнікаў чакаюць цікавыя сустрэчы з калекцыянерамі, а таксама з навукоўцамі, супрацоўнікамі і студэнтамі геаграфічнага факультэта БДУ. Акрамя таго, у рамках выставы будуць працаваць тэматычныя экспазіцыі. Так, у першы дзень «Каменнай казкі» адкрыецца экспазіцыя «Творчасць майстра і прыроды», дзе будуць прадстаўлены экспанаты Музея землязнаўства геаграфічнага факультэта БДУ.

На 25 лютага запланавана прэзентацыя «Даскаласць прыроды ў крышталях». З дакладам на гэтую тэму выступіць старшы выкладчык кафедры дынамічнай геалогіі Сяргей Юдаеў. Тут жа адкрыецца фотавыстава «У каменным царстве самацветаў».

Мультымедыйная прэзентацыя «Па слядах былых сустрэч» і ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу адбудуцца 27 лютага. Пераможцаў вызначаць у трох намінацыях: эксклюзіўная работа майстра, самыя прывабныя мінералагічны экспанат і навукова-асветніцкая экспазіцыя.

На працягу пяці дзён у выставачнай зале можна будзе ўбачыць і набыць аўтарскія работы з натуральных прыродных матэрыялаў майстроў і рамеснікаў з Беларусі, Расіі і Украіны. Мінералагічная выстава-кірмаш «Каменная казка» будзе працаваць з 11 да 20 гадзін да 28 лютага ўключна.

Надзея НІКАЛАЕВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ На слыху

КРЫМІНАЛЬНА-СПАРТЫЎНЫ ДУЭТ

У Жлобіне затрымалі дваіх мясцовых жыхароў, якія за апошнія пяць гадоў здзейснілі сорак вымаганняў. Першы намеснік начальніка УУС Гомельскага аблвыканкама Сяргей ДЗЯМКОЎСКІ расказаў, што, апроч гэтага, мужчынам інкрымінуюцца махлярствы, рабаванне, наўмыснае прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў і крадзеж дакументаў.

Многія адмаўляюцца верыць, што два спартсмены, якія займаліся вольнай барацьбой і не мелі крымінальнага мінулага, аказаліся ваўкамі ў шкуры авечак. Але ж факты, сабраныя праваахоўнікамі, няумольныя.

На працягу доўгага часу зламыснікі запужвалі двух мясцовых мужчын, якія мелі нядрэнны афіцыйны заробак. Дарэчы, адзін з іх у некаторыя месяцы атрымліваў на рукі ўсяго 400-500 тысяч рублёў. Астатнія сродкі ішлі на пагашэнне ўзятых «па просьбе» вымагальнікаў крэдытаў.

А пачалося ўсё з таго, што пяць гадоў таму адзін з вымагальнікаў папрасіў будучую ахвяру на сваё імя купіць тавар у крэдыт. Маўляў, сам не можа, бо мяняе пашпарт. Адмовіць знаёмаму мужчына пабаяўся і аформіў растэрміноўку на сябе. Спачатку некалькі разоў намякаў пра неабходнасць аплачваць дагавор. Але той ад аплаты адмовіўся. Грошы прыйшлося аддаць са сваёй кішэні. Першая беспакаранасць выклікала шэраг аналагічных «просьбаў» — ужо не толькі да яго, але і да сябра.

З падобнымі «просьбамі» да таварышаў стаў звяртацца і трэнер ДЮСШ. Дайшло да таго, што пашпарты ахвяр вымагальнікі захоўвалі ў сябе. Загадзя нагледжвалі патрэбныя рэчы, складалі спіс і давалі каманду, куды пад'ехаць. Уручалі пашпарт і спіс неабходнага. Пасля забіралі тавар. Аператыўнікі высветлілі, што такім чынам злачынцы сталі гаспадарамі ноўтбукаў, аўтамабільных запчастак, тэлевізараў, дзвярэй, залатых упрыгажэнняў... Рамонты ў кватэрах рабіліся таксама за кошт ахвяр.

Калі адзін з мужчын адмовіўся выконваць «даручэнні» і вырашыў змяніць месца працы, яго жорстка збілі. Нават пасля цяжкіх пашкоджанняў, якія былі нанесены пацярпеламу, ён не адразу адважыўся назваць імёны тых, хто з яго здзекваўся. Баялася штосьці казаць міліцыянерам і жонка пацярпелага. І ўсё ж урэшце пракурор Жлобінскага раёна завёў крымінальную справу па прыкметах наўмыснага прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Пасля гэтага і пачала паступова высвятляцца сапраўдная карціна вымаганняў. Падчас вобыску кватэр вымагальнікаў знайшлі пашпарт адной з ахвяр, ксеракопіі крэдытных дагавораў на набыццё бытавой тэхнікі з растэрміноўкай плацяжу.

Усяго заведзена больш за 50 крымінальных спраў у дачыненні да крымінальнага дуэта.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■ Выпрабавана на сабе

ЯК МЯНЕ РАБІЛІ «ДАРМАЕДАМ»,

або Купіце хоць што-небудзь...

Карэспандэнта «Звязды» паспрабавалі зрабіць распаўсюджвальнікам «натуральнай» касметыкі ды «крамлёўскіх лекаў». Фактычна ён мог стаць «дармаедам», які, афіцыйна не працуючы, не плаціць падаткаў. Журналіст адмовіўся не толькі разбагацець, але і ад прэміяльнай паездкі на Карыбскія астравы таксама.

СУП ПАРАШКОВЫ ЛЕПШЫ ЗА БОРШЧ?

Бывае, што жывеш з чалавекам у адным горадзе, на адлегласці некалькіх кварталаў, а можаце не бачыцца гадамі... Мой равеснік Валерый адзін з такіх. Калісьці бывалі ў яго ў гасцях, перыядычна сустракаліся па працы. І вось зусім выпадкова, гадоў праз 5-6, знайшліся! Ён, як мне здалося, шчыра пацікавіўся тым, што новага ў маім жыцці, запрасіў у госці. Як высветлілася пазней, Валерый займаецца распаўсюджваннем прадукцыі вядомай замежнай кампаніі. Прадае касметыку, прадукты харчавання, тавары для дома... За кавай падчас размоў пра жыццё мой суразмоўца пацікавіўся тым, наколькі мяне радуе заробак. Калі пачуў, што хацелася б больш, быццам уключыў унутры сябе нейкі «дыск». Расказваў мне пра вялікую выгаду. Абяцаў, калі пагаджуся стаць кансультантам, сам змагу купляць прадукцыю з вялікімі зніжкамі — каля 20%. Пры гэтым адмовіўся прадаць мне нешта па прывабнай цане: яму ж гэта не выгадна! А, калі нехта ў мяне што-небудзь купіць, мая выгада — да 40%. Дарэчы, пра цэны. Шампунь для валасоў і цела ў той фірме каштуе больш за 61 тысячу рублёў (яшчэ запэўнівалі, што з вялікай зніжкай), аналагічны беларускі — у тры разы танней. Мой таварыш пераконваў, што прадукцыя замежнай фірмы — толькі з натуральных кампанентаў. А што, беларускія аналагі з нафты робяць? Не! І нават «зоркі» іх купляюць. Бываючы ў Беларусі, напрыклад, спявак Кабзон шмат закупляе беларускіх шампуняў і іншага. Асабіста чуў ад яго падчас фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».

Майго патэнцыйнага кіраўніка «несла», як таго Астапа Бэндара перад сеансам адначасовай гульні ў шахматы. Нездарма такіх, як ён, вучаць па спецыяльнай методыцы. Сэнс апошняй — «загаварыць» так, каб патэнцыйны кансультант, паверыўшы ў сваю выгаду, пачаў працаваць на «піраміду» — тых, хто над ім. Мэта пачаткоўца — хутчэй сабраць каманду, якая будзе дапамагаць бізнесу ужо яму... Рэкламаваў ён і прадукты здаровага харчавання, у тым ліку для зніжэння вагі, антыаксіданты. Сцвярджаў, што суп у пакеце — натуральная ежа, карысная для арганізма. Ну, не можа парашок канкурыраваць з сапраўдным баршчом! Ён пахваліўся, што ў месяц зарабляе ў эквіваленце тысячу долараў. А я, калі неадкладна ўцягнуся ў працэс распаўсюджвання, змагу не толькі больш разбагацець, але і прэтэндаваць на паездку на мора. Мне абяцалі адпачынак на Карыбскіх астравах у кампаніі такіх жа «шчасліўчыкаў».

Наконт законнасці бізнесу таварыш, вядома, сказаў, што ўсё легальна: падаткі фірма выплачвае, а кансультантам хвалявацца не трэба.

Тэлефанаваў мне на мабільны знаёмец вельмі настойліва: штодня па некалькі разоў. Толькі праз тыдзень зразумеў, што не буду я нічога прадаваць... І цяпер не турбуе больш.

ПРА «КРАМЛЁЎСКІЯ ПІЛЮЛІ» І КАТА

Праз некалькі дзён на вуліцы таксама выпадкова сустрэлася мне былая калега. Успомнілі вясёлы калектыў, дзе працавалі, пагаварылі па душах. Вельмі карэктна Яўгенія пацікавілася станам майго здароўя. Прызнаўся, што ў апошні час яно не радуе. Яна спачатку расказала пра свае хваробы, а потым плаўна перайшла на тэму ўрачоў і лекаў. Апошнія, паводле яе слоў, у большасці сваёй нічога не разумеюць, а лекі ў аптэках — толькі грошы на іх дарма прыходзілася траціць.

— Але мне пашанцавала. А ўсё таму, што знаёмая параіла сапраўдныя сродкі, вырабленыя ў сібірскім навукова-даследчым інстытуце. Чуў пра «крамлёўскія пілюлі»? Дык гэта яны рабілі! Усе прэпараты з зёлак сібірскіх! Наконт якасці, вось, пагадзіся, ката ж не падманеш. Мой кот, калі я купляла валяр'янку ў аптэцы, ніяк на яе не рэагаваў, а сібірскую адразу палюбіў. Хвастаты, калі толькі адчувае пах, ходзіць вакол бутэлечкі і просіць. Пра што расказваць, калі самі ўрачы купляюць прадукцыю з Сібіры! Так, усе неабходныя дакументы, якія пацвярджаюць якасць прадукцыі, ёсць. Ты таксама можаш сабе і сваім знаёмым лекі купляць, — расказвала Яўгенія.

Не надаў асаблівага значэння нашай размове, пакуль не «пасябравалі» з ёй у сацыяльнай сетцы. Падчас перапіскі зноў жа абмяркоўвалі розныя жыццёвыя пытанні, і раптам атрымаў прапанову паслухаць лекцыю. Маўляў, паважаны ў горадзе ўрач можа праверыць стан здароўя пры дапамозе ўнікальнага прыбора. Не, ніякіх артыкулаў пра яе не трэба, кансультуе не ўсіх...

Дзеля інтарэсу збіраўся сустрэцца з доктарам. Заінтрыгавала, што першая сустрэча можа адбыцца ля гандлёвага цэнтра. Знаёмая напісала, што проста ёй так зручней... А лекцыю слухаць будзем на вуліцы або ў кавярні?

Знаёмая пакрыўдзілася на тое, што не мог сустрэцца са «свяцілам медыцыны» ў прызначаны дзень і час, бо трэба было сына адвесці ў гурток. Яна напісала ў чарговым лісце, што здароўе — большая каштоўнасць, чым адзін нейкі занятак танцамі, які можна і прапусціць. Маўляў, прычыну, каб не сустрэцца, знайсці заўсёды можна.

«ЗНАЁМЫЯ ВАС ПАРАІЛІ!»

...На мабільны нехта патэлефанаваў. Прыгожы жаночы голас паведаміў, што я магу прыняць удзел у акцыі, каб у Віцебску вада ў кранах стала чыстай! Маўляў, мы нічога не прадаём, проста просім дазвол праверыць у вас дома якасць вады. Во як! Пачуў, што нумар майго мабільнага тэлефона далі прадстаўніку кампаніі мае знаёмыя. Праўда, іх прозвішчы так і не агучылі. Маўляў, яны запісаны ў нататніку іншага менеджара. Спачатку пагадзіўся, каб да мяне прыйшлі і праверылі якасць вады. І толькі потым зразумеў: спрабуюць задурыць галаву... Узгадаў, што знаёмы расказваў, як яго «раскручвалі» аналагічным чынам на пакупку фільтра для вады! «Змагарка» за чыстую ваду тэлефанавала мне не раз. Усё запэўнівала, што ніякага падману, што, калі я супраць таго, каб піць чыстую ваду, праблемы мае... Але каб потым не пашкадаваў.

Днямі маме патэлефанавалі, але з іншай фірмы. Сказалі, што яна выйграла нейкі падарунак. Каб яго ўручылі, трэба прыехаць у офіс. Што за падарунак — сакрэт! Але пры гэтым гарантуюцца зніжкі пры пакупцы касметыкі...

Аляксандр ПУКШАНСКІ

КАМПЕТЭНТНА

Наколькі законны такі продаж «з рук» пацікавіўся я ў старшага пракурора аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці па нагляду за выкананнем заканадаўства ў войсках Віктара КАЛБУНА?

— Вытворчасць і рэалізацыя медыцынскіх прэпаратаў, у тым ліку біялагічна актыўных дабавак да ежы, медыцынскага абсталявання, з'яўляюцца ліцэнзаванымі відамі дзейнасці. Парадак рэалізацыі названай катэгорыі тавараў прадугледжаны заканадаўствам.

Прадпрымальніцкая дзейнасць без спецыяльнага дазволу, калі такі дазвол абавязковы, цягне адміністрацыйную адказнасць. Калі ж атрыманы ад такой незаконнай дзейнасці даход перавысіць у 1000 і больш разоў памер базавай велічыні, то правапарушальнік можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці.

Уцечка баз звестак з нумарамі мабільных тэлефонаў практычна выключаная. Фірмы, як правіла, бяруць інфармацыю з сацыяльных сетак альбо ад пакупнікоў іх тавараў, якія пакідаюць нумары сваіх сяброў наўзамен бонусаў (зніжкі, падарункі і г.д.),

ЧАЛАВЕК СТАЛЬНОЙ ВОЛІ,

або Шлях ад дыверсанта да старшыні калгаса-мільянера

КІРЫЛА ПРАКОПАВІЧ АРЛОЎСКІ — чалавек дзіўнай біяграфіі. Кіраўнік партызанскага дыверсійнага атрада ў Польшчы, удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі, парэктар па гасчастцы сельскагаспадарчага інстытута, савецкі разведчык у Кітаі, кіраўнік беларускага партызанскага атрада ў час Вялікай Айчыннай вайны. Пазбавіўшыся абедзвюх рук, ён не ўпаў духам і ўзначаліў у 1945 годзе калгас у Беларусі, які першым у СССР атрымаў чысты прыбытак у мільён рублёў.

Ён нарадзіўся 120 гадоў таму — 30 студзеня 1895 года ў вёсцы Мышкавічы (цяпер гэта Кіраўскі раён Магілёўскай вобласці) у сям'і селяніна. У 1915–1918 гадах служыў у царскай арміі унтэр-афіцэрам, камандзірам сапёрнага ўзвода. Удзельнічаў у Першай сусветнай вайне.

У чэрвені 1918-га па заданні падпольнага Бабруйскага павятовага камітэта партыі стварыў партызанскі атрад, які дзейнічаў супраць акупацыйных нямецкіх войскаў. Са снежня 1918 года па красавік 1919-га працаваў у Бабруйскай ЧК, затым скончыў курсы камсастава.

У лістападзе 1918 года, пасля паражэння Германіі ў Першай сусветнай вайне, нямецкія часці пачалі выходзіць з занятых імі тэрыторый былой Расійскай імперыі. Савецкая Заходняя армія, у задачу якой уваходзіла арганізацыя кантролю ў тым ліку і над тэрыторыяй Беларусі, 17 лістапада 1918 года рушыла ўслед за немцамі і 10 снежня ўступіла ў Мінск.

Тым часам палякі на тэрыторыі Літвы і Беларусі стварылі так званы Камітэт абароны ўсходніх украін (КАУУ) з баявымі падраздзяленнямі, сфарміраванымі з былых салдат польскіх карпусоў, і звярнуліся па дапамогу да польскага ўрада. Указам польскага кіраўніка («часовага начальніка дзяржавы») Юзэфа Пілсудскага ад 7 снежня 1918 года атрады КАУУ аб'яўляліся складовай часткай Войска Польскага пад агульным камандаваннем генерала Уладзіслава Вейткі. 19 снежня польскі ўрад даў загад сваім войскам заняць Вільню. Так пачалася савецка-польская вайна 1919–1921 гадоў.

Яе вынікам стала тое, што Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна адышлі да Польшчы, а тэрыторыя Літвы была падзелена паміж Польшчай і створанай незалежнай Літоўскай дзяржавай. Вільня таксама адышла Польшчы.

Пасля вайны і заключэння мірнага дагавора з Польшчай у сакавіку 1921 года разведупраўленне штаба Чырвонай Арміі пачало стварэнне і перакідванне на тэрыторыю Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі атрадаў для арганізацыі масавага ўзброенага супраціўлення польскім уладам. Меркавалася, што гэтыя ўзброеныя атрады стануць ядром усенароднага партызанскага руху на захопленых беларускіх і ўкраінскіх землях, які ў перспектыве прывядзе да іх вызвалення і ўз'яднання з СССР. Падобная дзейнасць атрымала назву «актыўная разведка». Пры гэтым трэба заўважыць, што дзейнасць Разведупра па актыўнай разведцы была настолькі старанна заканспіраванай, што пра яе не ведалі нават органы АДПУ.

ПАРТЫЗАНСКІ, а па сутнасці — дыверсійны рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі пачаўся ўжо ўлетку 1921 года. Аднымі з камандзіраў такіх дыверсійных атрадаў былі Кірыл Арлоўскі і Станіслаў Ваўпшасаў. Вось якія звесткі пра дзеянні гэтых двух атрадаў прыводзяцца ў кнізе А. І. Калпакідзі і Д. П. Прохарава «Імперыя ГРУ. Нарысы гісторыі расійскай ваеннай разведкі»:

«У маі 1922 г. у раёне Белавежскай пушчы быў разгромлены паліцэйскі ўчастак;

11 чэрвеня 1922 г. 10 партызанаў захапілі і спалілі маёнтак «Добрае дрэва» Грудніцкага павета;

з 15 чэрвеня па 6 жніўня 1922 г. на тэрыторыі Гродзенскага і Іліцкага паветаў было праведзена 9 баявых аперацый, у ходзе якіх партызаны разграмілі тры памешчыцкія маёнткі, спалілі палац князя Друцкага-Любяцкага, узарвалі два паравозы на вузкакалейнай дарозе, якая належыць французскай фірме, і чыгуначны мост, знішчылі на вялікім працягу чыгуначнае палатно на лініі Ліда — Вільня. Пры гэтым у адным з баёў было забіта 10 польскіх уланаў;

14 кастрычніка 1922 г. партызаны спалілі маёнтак Струга Столінскага павета.

У 1923 г. партызанскі рух узмацніўся:

у ноч з 19 на 20 мая 1923 г. 30 партызанаў разграмілі паліцэйскі ўчастак і гмінную ўправу ў Чучавічах Лунінецкага павета;

27 жніўня аналагічную аперацыю правялі ў мястэчку Целяханы Косаўскага павета. Пры гэтым былі забіты два паліцэйскія і войт (стараста);

29 жніўня 10 партызанаў напалі на маёнтак Моладава Драгічынскага павета.

З красавіка па лістапад 1924 года партызаны правялі 80 буйных баявых аперацый. Самая вядомая з іх — у горадзе Стоўбцы, дзе ў ноч з 3 на 4 жніўня 54 баевікі на чале са Станіславам Ваўпшасавым разграмілі гарнізон і чыгуначную станцыю, а заадно староства, павятовае ўпраўленне паліцыі, гарадскі паліцэйскі ўчастак, захапілі турму і вызвалілі кіраўніка ваеннай арганізацыі кампартыі Польшчы Станіслава Скульскага (Мертэнса) і кіраўніка кампартыі Заходняй Беларусі Паўла Корчыка, што, уласна, і з'яўлялася мэтай гэтай дзёрзкай аперацыі. Пры гэтым 8 паліцэйскіх былі забіты і трое паранены.

24 верасня 1924 г. 17 партызанаў з атрадаў Арлоўскага і Ваўпшасава, арганізаваўшы засаду на ўчастку Парахонск — Лоўча па чыгуначнай лініі Брэст — Лунінец, напалі на цягнік. У выніку яны схапілі ваяводу Палесся Даўнаровіча. Праявіўшы гуманізм, яго не сталі расстрэльваць, а адлупцавалі пугай, пасля чаго ён вымушаны быў падаць у адстаўку. Партызаны таксама захапілі пошту і раззброілі салдат і афіцэраў, якія ехалі ў цягніку…».

Дзеянні Арлоўскага і Ваўпшасава настолькі моцна трывожылі польскае кіраўніцтва, што яно аб'явіла вялікую ўзнагароду за іх вышук і арышт (у загадзе фігуруе Муха-Міхальскі — адзін з псеўданімаў, які выкарыстоўвалі Арлоўскі і Ваўпшасаў).

«Прэзідыум ваяводства Польскага
А1131
9/V-1924

Змест: прызначэнне ўзнагароды за пошук Мухі-Міхальскага.

Пану старасту (уласнаручна) у Століне.

На падставе прадстаўлення міністэрства ўнутраных спраў Старшыня Савета Міністраў прызначыў за злоў бандыта Мухі-Міхальскага 10 мільярдаў марак і разам з тым абяцаў узнагароду да 5 мільярдаў марак таму, хто дасць адпаведную інфармацыю органам паліцыі і будзе спрыяць арышту згаданага бандыта».

У 1925 годзе савецкае кіраўніцтва аддало ўказанне партызанскім атрадам спыніць «партызанскія метады барацьбы і сканцэнтраваць усе намаганні на арганізацыйна-масавай рабоце сярод сялян». У чэрвені 1925-га паўстанцкія атрады былі расфарміраваны, частка баевікоў перабралася ў БССР, другая ж засталася ў Польшчы, пераехаўшы на жыхарства ў аддаленыя ад родных мясцін паветы.

Удалейшым, з 1925-га па 1930 год, Арлоўскі вучыўся ў Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцяў Захаду імя Мархлеўскага. Гэтая ўстанова рыхтавала палітычных работнікаў з прадстаўнікоў нацыянальнасцяў Захаду СССР на базе Літоўска-яўрэйска-латышскай, Нямецкай, Польскай, Румынскай вышэйшых партыйных школ.

Велізарны вопыт, атрыманы за час працы дыверсантам у Польшчы, Арлоўскі выкарыстаў у далейшым — з 1930-га па 1936-ы працаваў пры асобым аддзеле НКУС БССР па падборы і падрыхтоўцы чырвонапартызанскіх кадраў на ваенны час.

У 1936 годзе па асабістым жаданні Арлоўскі працаваў на будаўніцтве канала Масква — Волга ў якасці начальніка будаўнічага ўчастка.

А праз год, у 1937-м, ён адправіўся дапамагаць рэспубліканцам у Іспанію, дзе дзейнічаў пад псеўданімам Стрык (ад striker — ударнік у спускавым механізме стралковай зброі).

Вось адзін з яго рапартаў:

«Вельмі сакрэтна.

Асобнік адзіны

Дакладваю, што 30 мая 1937 года я з групай у 10 чалавек іспанцаў і адным чалавекам рускім [Сцяпан Грушко] перайшоў лінію фронту і накіраваўся ў глыбокі тыл фашыстаў для дыверсійнай работы.

З 30 мая па 20 ліпеня 1937 года з вышэйзгаданай групай я прайшоў у тыле праціўніка 750 км і толькі адзін раз, 15 ліпеня, група была выяўлена праціўнікам, пра што напішу ніжэй.

За згаданы час мною з групай была праведзена наступная работа:

Уначы з 2 на 3 чэрвеня 1937 года ўзарваны таварны цягнік праціўніка каля гары Капітана на чыгуначнай лініі Севілья-Бадахас.

Ноччу, дакладней, у 10 гадзін вечара, 11 чэрвеня 1937 г. мною падарваны пасажырскі цягнік на чыгуначнай лініі Севілья — Касалья-дэ-ла-Сьера, недалёка ад станцыі Эль-Педроса.

На працягу 33 сутак я з групай прайшоў па трох правіліцях 500 км, дзе сустракаліся дзясяткі даволі ўразлівых месцаў для праціўніка, якія былі для мяне з групай цалкам па сілах для нанясення ўдараў праціўніку з тылу. Напрыклад, за 30 кіламетраў на поўдзень ад горада Севілья ёсць тры машыны для падачы вады, якія каштуюць 11 млн песет; яны арашаюць тысячы гектараў рысавых палёў, ахоўваюцца трыма вольнанаёмнымі фашыстамі.

…Я настойваў на знішчэнні гэтых машын, але большасць асабовага складу групы як ад гэтай, так і ад іншых падобных аперацый адмовілася, а таму з 2 па 7 ліпеня мною была праведзена чыстка асабовага складу групы, дакладней, адхіленне ад далейшых паходаў з маёй групай 7 чалавек — шкурнікаў, сімулянтаў і баязліўцаў — і замена іх больш дысцыплінаванымі і стойкімі партызанамі з атрада, які знаходзіцца ў гарах, што ў 50 км на паўночны захад ад Севільі з мэтай ажывіць і актывізаваць у баявых адносінах групу. Гэта я зрабіў, і 7 ліпеня з 8 іспанцамі і 1 чалавекам рускім рушыў на ўсход.

10 ліпеня на дарозе, якая ідзе з Севільі ў Бадахас… я вырашыў зрабіць засаду на аўтатранспарт праціўніка з мэтай знішчэння яго жывой сілы і транспарту, але калі я з людзьмі сваёй групы стаў абмяркоўваць гэтую аперацыю за 3–4 гадзіны да яе выканання, то тут жа тры чалавекі іспанцаў адмовіліся ад удзелу ў гэтай справе. У 8 гадзін вечара мы, 7 чалавек, выйшлі на згаданую дарогу: знішчылі 17 чалавек фашыстаў, 2 чалавекі параніліі і знішчылі 2 грузавікі і адзін легкавік. Пасля чаго самі адступілі ў горы. Гэта была сапраўды геніяльная аперацыя. Недалёка ад Севільі днём з невялікай групай маіх байцоў

3) прыбраць памешчыка, які 4 чэрвеня перадаваў фашыстам звесткі аб тым, што яго пастух у нейкім месцы заўважаў нас, партызанаў.

Высновы. *Хто чытае гэты кароткі даклад, можа падумаць, што мною з групай здзейснены геніяльны паход, затрачана вельмі шмат энергіі з невераголным напружаннем нерваў, што як толькі мог вытрымаць я (Стрык) з надламаным пазваночнікам, рэўматызмам у суставах ног і ва ўзросце 43-х гадоў пераадолець гэты шлях і ўсе яго цяжкасці? Так, цяжкасці, страта энергіі і напружанне нерваў неймаверна вялікія. Па гарах, скалах, абрывах, усеяных камянямі з калючымі хмызнякамі і калючай травой, выключна ўначы, пройдзена 750 км, часта без прадуктаў і вады. Асабліва цяжкія былі тыя гадзіны і дні для мяне, як для кіраўніка групы, калі большасць іспанцаў адмаўлялася ад выканання намечаных і распрацаваных мною аперацый (бо баяліся), калі яны занадта даверліва ставіліся да ўсіх іспанцаў, якія сустракаюцца на дарозе, расказваючы ім наш шлях і нашы мэты, што ў любы час магло прывесці да разгрому групы, і калі частка з іх часцяком засынала на пасту.*

Пераадолеў усё гэта я дзякуючы неабмежаванай нянавісці да ворагаў народа — фашыстаў, і любові да сваёй справы, да сваёй прафесіі. Але калі б я здзяйсняў гэты паход з больш баяздольнымі партызанамі, то вынік нашай працы быў бы ў шмат разоў лепшым...

23 ліпеня 1937 г. Стрык».

Кіраўніцтва інтэрбрыгады назвала гэты рэйд «бяспрыкладным», аднак сам Арлоўскі быў незадаволены вынікам, лічачы, што эфект быў бы непараўнальна большым, калі б не баязлівасць і разгільдзяйства іспанцаў. Пасля паходу быў выдадзены катэгарычны загад камандавання корпуса больш не даваць Арлоўскаму, які «вызначаецца выключнай асабістай адвагай», падобных заданняў, каб пазбегнуць неабгрунтаванай рызыкі. Арлоўскага прызначылі дарадцам Мадрыдскага інтэрнацыянальнага разведвальна-дыверсійнага атрада. Тым не менш ён яшчэ двойчы выводзіў групы ў рэйды. Падчас адной з апошніх сутычак з франкістамі Кірыла Пракопавіч атрымаў цяжкую кантузію пазваночніка ад блізкага разрыву гранаты.

У лістападзе 1938-га Арлоўскі вярнуўся ў СССР. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з іспанскімі фашыстамі, Кірылу Пракопавіча ўганаравалі найвышэйшай узнагародай СССР — ордэнам Леніна, які ўручалі проста ў шпіталі. Урачы тым часам вынеслі свой вердыкт. Ён быў суровы — камісаваць, да працы ў спецслужбах не прыдатны.

Дарэчы, Арлоўскі цэлы тыдзень жыў у Мадрыдзе ў адным гатэлі «Гэйлорд» з Хэмінгуэем і меў стасункі з ім. Ён жа стаў прататыпам Роберта Джордана ў аповесці Хэмінгуэя «Па кім звоніць звон».

Работнікі аддзела кадраў НКУС дапамаглі з працаўладкаваннем, і Арлоўскі быў накіраваны намеснікам рэктара па гаспадарчай частцы Арэнбургскага (тады Чкалаўскага) сельскагаспадарчага інстытута, дзе ён не толькі выконваў сваю працу, але і ўхітраўся вучыцца, наведваючы заняткі. Непахісная воля Арлоўскага ўжо праз год вярнула яго ў строй.

Звесткі аб яго знаходжанні ў Арэнбургу ўрывачныя. Прафесар Г. М. Удовін, успамінаючы пра яго, заўважыў: «Лепшага прарэктара па гаспадарчай частцы я не сустракаў. Гэта быў чалавек слова, які заўсёды выконвае свае абавязкі».

У сакавіку 1941 года пад выглядам супрацоўніка Наркамата каляровай металургіі Арлоўскі выязджае ў Алма-Ату для арганізацыі базы нашай агентуры ў Кітаі — чакалася вялікая вайна з Японіяй, і вопыт Кірылы Пракопавіча быў вельмі дарэчы. Арганізаваўшы працу на базе, Арлоўскі са спецыяльным заданнем адбывае ў Сіньцзян (Кітай); там ён выратоўвае савецкага рэзідэнта, выкраўшы яго літаральна з-пад носу ў кітайскай контрразведкі. Рэзідэнт быў вывезены ў СССР у цюку ваты.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны «Кірыл» (так у далейшым стаў праходзіць Кірыла Пракопавіч у аператыўнай перапісцы) сустрэў у Сіньцзяне. Параўнальна нядаўна вярнуўшыся з гарніла іспанскай вайны і акунуўшыся ў ціхае, мернае жыццё, «Кірыл» адчуваў сябе няўтульна і некамфортна ў Сіньцзяне. Яго душа рвалася ў родную Беларусь, захопленую ворагам (ужо на шосты дзень вайны фашысты захапілі Мінск). І таму нядзіўна, што паміж ім і рэзідэнтам «Мірабо» на гэтай глебе сталі ўзнікаць супярэчнасці па працы. У гутарках з «Мірабо» «Кірыл» неаднаразова казаў: «Я партызан-баявік, а не аператыўнік».

Ужо 31 жніўня 1941 года «Мірабо» паведаміў у Маскву «Віктару» (начальніку 1-га ўпраўлення НКДБ СССР П. М. Фіціну):

ЗАЯВА

Прашу Вашага распараджэння накіраваць мяне ў тыл нямецка-фашысцкіх войскаў для чырвонапартызанскай і дыверсійнай работы, дзе я змагу прынесці непараўнальна больш карысці ў справе абароны сацыялістычнай Айчыны, чым знаходзячыся тут на гаспадарчай рабоце, паколькі ў чырвонапартызанскай і дыверсійнай рабоце я маю вопыт не толькі ў тыле нямецкіх акупантаў у 1919 годзе і ў тыле белапалякаў з 1920 па 1925 год, але і ў глыбокім тыле фашысцкіх войскаў у Іспаніі ў 1937 годзе.

За сямігадовую працу мне даводзілася нелегальна дзясяткі разоў пераходзіць лініі франтоў і дзяржаўных межаў і праводзіць дзясяткі дыверсійных баявых аперацый, граміць праціўніка, разбураць яго камунікацыі і ўсяляць паніку. У верасні 1941 г. я такую заяву пісаў на імя т. Фіціна, але адказ атрымаў праз т. Шыбаева такі: «Заяву ваша атрымалі. Маем на ўвазе, пры неабходнасці паклічам».

Я думаю, што патрэба ў гэтай працы цяпер як ніколі маецца, і што калі Вы мяне пашляце, то я аддам усе свае думкі, пачуцці, сэрца і буду так, як і раней, граміць заклятага ворага чалавецтва нямецкіх фашыстаў і знішчаць у тыле фашысцкую нечысць, якая ўварвалася на нашу савецкую зямлю.

Ён стаў камандаваць партызанскім атрадам спецыяльнага прызначэння «Сокалы», які дзейнічаў у Баранавіцкай вобласці Беларускай ССР. Атрад паспяхова правёў шэраг аперацый па знішчэнні прамысловых аб'ектаў і воінскіх эшалонаў ворага. Дзеянні народных мсціўцаў сустракалі гарачую падтрымку насельніцтва чашлося везці мяне ў суседні атрад. Урач думаў, што без наркозу я не вытрымаю аперацыі. Я сказаў: «Давайце без наркозу». Урач адказаў: «У мяне няма пілы». Пілу яму знайшлі. Слясарную пілу-нажоўку. Яе навастрылі, вычысцілі наждаком, выварылі ў кіпені.

Аперацыю вырашылі рабіць на адкрытым паветры — у зямлянцы цёмна. Убілі ў снег калы, на іх паклалі лыжы. Але нядоўга прыйшлося ляжаць мне на гэтым хірургічным стале.

Фашысты арганізавалі аблаву. Мяне ўзвалілі ў сані, закідалі кажушкамі і павезлі кіламетраў за трыццаць. Я чакаў, пакуль скончыцца бой. Тады ўрач скончыў аперацыю, а да гэтага яму не было калі — ён быў за другі нумар ля кулямёта.

Разумееце, як шмат я вытрываў, але, каб жыць, варта было гэта трываць.

Праз тры месяцы я падняўся. Партызаны не далі мне стаць калекам. Я зноў камандаваў сваім атрадам. І, мабыць, нядрэнна мы білі ворага. Увосень мяне выклікалі ў Маскву. Я прыйшоў да сабе дадому і спыніўся перад дзвярыма. За дзвярыма былі жонка і дзеці. Я пастукаў у дзверы нагой, таму што пазваніць мне не было чым…».

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 20 верасня 1943 года за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Арлоўскаму Кірыле Пракопавічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка» (№ 1720).

ТАКІМ чынам, праз цяжкія фізічныя калецтвы — ад абедзвюх кісцей рук у яго застаўся толькі адзін палец — Кірыла Пракопавіч ужо не мог ваяваць. Здавалася б, заставалася толькі ціха дажываць свой век; дабрабыт яго дзяржава матэрыяльна забяспечыла б. Але ён быў чалавек іншага складу характару. 6 ліпеня 1944 года, калі яшчэ ішла вайна і Беларусь не была цалкам вызвалена, ён напісаў ліст Сталіну з просьбай прызначыць яго старшынёй калгаса «Чырвоны партызан» у яго роднай вёсцы ў Магілёўскай вобласці. Вось гэты ліст з невялікімі скарачэннямі:

«Масква, Крэмль, таварышу Сталіну
Ад Героя Савецкага Саюза
падпалкоўніка дзяржаўнай бяспекі
Арлоўскага Кірылы Пракопавіча
Заява.

Дарагі таварыш Сталін!

Дазвольце на некалькі хвілін затрымаць Вашу ўвагу, выказаць Вам свае думкі, пачуцці і імкненні.

З 1918-га па 1943 год мне пашчасціла 8 гадоў працаваць у тыле ворагаў СССР у якасці камандзіра партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп, нелегальна пераходзіць лінію фронту і дзяржаўную мяжу звыш 70 разоў, выконваць урадавыя заданні, знішчаць сотні заўзятых ворагаў Савецкага Саюза як у ваенны, так і ў мірны час, за што ўрад СССР узнагародзіў мяне двума ордэнамі Леніна, медалём «Залатая Зорка» і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Член ВКП (б) з 1918 года. Партыйных спагнанняў не маю.

Ноччу 17 лютага 1943 года агентурная разведка мне прынесла звесткі, што 17/II-43 г. па адной з дарог Баранавіцкай вобласці на падводах будуць праязджаць Вільгельм Кубэ (Генеральны камісар Беларусі), Фрыдрых Фёнс (камісар трох абласцей Беларусі), обергрупэнфюрар Захарыус, 10 афіцэраў і 40–50 іх ахоўнікаў.

У гэты час пры мне было толькі 12 чалавек маіх байцоў, узброеных адным ручным кулямётам, сямю аўтаматамі і трыма вінтоўкамі. Днём на адкрытай

8.12.41 г. Арлоўскі».

Факты, выкладзеныя ў архіўнай справе, сведчаць аб тым, што «Мірабо» і разведаддзел НКДБ Казахстана не спяшаліся з адпраўкай заявы «Кірыла» адрасату. Толькі ў лютым 1942 года разведаддзел НКДБ Казахстана накіроўвае ў Цэнтр рапарт «Кірыла» на адрас Л. П. Берыя з просьбай аб накіраванні яго ў тыл нямецкай арміі, лічачы мэтазгодным задавальненне гэтай просьбы.

«Кірыл», не ведаючы пра нетаропкія дзеянні разведаддзела і не дачакаўшыся адказу на свой ліст, 17 сакавіка 1942-га піша заяву на імя старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны СССР Іосіфа Сталіна. На гэты раз дзеянні «Мірабо» і разведаддзела НКДБ Казахстана былі імгненнымі.

На жаль, у архіўнай справе няма гэтага ліста. Па ўсім відаць, работнікі спецслужбаў не адважыліся зрабіць копію з дакумента, адрасаванага асабіста Сталіну. Пра змест даклада можна толькі меркаваць па шыфроўцы «Мірабо», адпраўленай з Кульджы ў той жа дзень у Цэнтр на адрас «Віктара» і «Аляксандрава». «Мірабо» паведамляў, што 17 сакавіка 1942 года «Кірыл» падаў ліст на імя І. В. Сталіна, у якім адзначаў свае магчымасці па працы ў тыле немцаў у раёнах Беларусі (веданне мовы, звычаяў, наяўнасць старых сувязяў сярод насельніцтва), прасіў накіраваць яго ў глыбокі тыл для партызанскай і дыверсійнай працы, лічачы, што гэтая дзейнасць можа прынесці больш карысці. На тэлеграме «Мірабо» мелася рэзалюцыя: «Тав. Мірошын, тэрмінова накіруйце заяву па прызначэнні, копію з падрабязнай нашай даведкай пашліце тав. Судаплатаву».

29 сакавіка 1942 года прыйшоў доўгачаканы адказ з Цэнтра. «Віктар» паведамляў, што «Кірыл» адклікаецца ў Маскву, і прасіў уладкаваць яго сям'ю ў Алма-Аце.

ЁН стаў камандаваць партызанскім атрадам спецыяльнага прызначэння «Сокалы», які дзейнічаў у Баранавіцкай вобласці Беларускай ССР. Атрад паспяхова правёў шэраг аперацый па знішчэнні прамысловых аб'ектаў і воінскіх эшалонаў ворага. Дзеянні народных мсціўцаў сустракалі гарачую падтрымку насельніцтва часпраз 17 лютага 1943 года, умела арганізаваўшы засаду, байцы атрада «Сокалы» знішчылі генеральнага камісара горада Баранавіч Фрыдрыха Фрэнча, гебітскамісара Баранавіцкай вобласці Фрыдрыха Шцюра і обергрупэнфюрара войскаў СС Фердынанда Засорнаса, захапіўшы важныя дакументы і зброю. У гэтым баі Арлоўскі быў цяжка паранены, страціўшы правую руку па плячо, а на левай — 4 пальцы, але не пераставаў кіраваць аперацыяй, пакуль не вывеў атрад у бяспечнае месца.

Вось як сам Кірыла Арлоўскі апісвае тое, што было далей:

«Я быў моцна паранены. Не ведаю, чаму я не сцёк крывёю. Мабыць, снег, насычаны крывёй, стаў як бы павязкай. У нашым атрадзе няма ўрача. Прыйсова акупаваных раёнаў, таму рады партызанаў пастаянна папаўняліся, і ў 1943 годзе атрад К. П. Арлоўскага налічваў больш за 350 байцоў.

мясцовасці, на дарозе, напасці на праціўніка было даволі рызыкоўна, але і прапусціць буйную фашысцкую гадзіну было не ў маёй натуры, а таму яшчэ да світання да самай дарогі я падвёў сваіх байцоў у белых маскіровачных халатах, паклаў ланцугом і замаскіраваў іх у снегавых ямах за 20 метраў ад той дарогі, па якой павінен быў праязджаць праціўнік.

Дванаццаць гадзін мне з таварышамі прыйшлося ляжаць у снегавых ямах і цярпліва чакаць…

У шэсць гадзін вечара з-за ўзгорка паказаўся транспарт праціўніка, і калі падводы параўняліся з нашым ланцугом, па маім сігнале быў адкрыты наш аўтаматна-кулямётны агонь, у выніку якога былі забітыя Фрыдрых Фёнс, 8 афіцэраў, Захарыус і больш за 30 ахоўнікаў.

Мае таварышы спакойна забралі ўсю фашысцкую зброю, дакументы, знялі з іх лепшую вопратку і арганізавана адышлі ў лес, на сваю базу.

З нашага боку ахвяр не было. У гэтым баі я быў цяжка паранены і кантужаны, у выніку чаго ў мяне былі ампутаваны правая рука па плячо, на левай — 4 пальцы і пашкоджаны слыхавы нерв на 50–60%. Там жа, у лясах Баранавіцкай вобласці, я фізічна акуняў і ў жніўні 1943 г. радыёграмай быў выкліканы ў Маскву.

Дзякуючы Народнаму камісару дзяржаўнай бяспекі таварышу Мяркулаву і начальніку 4-га ўпраўлення таварышу Судаплатаву матэрыяльна я жыву вельмі добра. Маральна — дрэнна.

Партыя Леніна-Сталіна выхавала мяне ўпарта працаваць на карысць любімай Радзімы; мае фізічныя недахопы (страта рук і глухата) не дазваляюць мне працаваць на ранейшай працы, але паўстае пытанне: ці ўсё я аддаў для Радзімы і партыі Леніна-Сталіна?

Да маральнага задавальнення я глыбока пераканаў ў тым, што ў мяне маецца досыць фізічных сіл, вопыту і ведаў для таго, каб яшчэ прынесці карысць у мірнай працы.

Адначасова з разведвальна-дыверсійнай і партызанскай работай я надаваў магчымую ўвагу працы над сельскагаспадарчай літаратурай.

З 1930-га па 1936 год па родзе сваёй асноўнай працы я кожны дзень бываў у калгасах Беларусі, грунтоўна прыглядзеўся да гэтай справы і палюбіў яе.

Сваё знаходжанне ў Чкалаўскім сельскагаспадарчым інстытуце, а таксама Маскоўскую сельскагаспадарчую выставу я выкарыстаў да дна ў атрыманні такой колькасці ведаў, якая можа забяспечыць арганізацыю ўзорнага калгаса.

Калі б урад СССР адпусціў крэдыт у памеры 2.175 тысяч рублёў у атаваным выражэнні і 125 тысяч рублёў у грашовым выражэнні, то я на маёй радзіме, у вёсцы Мышкавічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці, у калгасе «Чырвоны партызан», да 1950 года дамогся б наступных паказчыкаў:

1. Ад ста фуражных кароў (у 1950 г.) змагу дасягнуць надою малака не менш за восем тысяч кілаграмаў на кожную, адначасова змагу з кожным годам павышаць жывую вагу малочна-племянной фермы, паляпшаць экстэр'ер, а таксама павышаць працэнт тлустасці малака.

2. Сеяць не менш за семдзесят гектараў лёну і ў 1950 г. атрымаць не менш за 20 цэнтнераў ільновалакна з кожнага гектара.

3. Сеяць 160 гектараў збожжавых культур (жыта, авёс, ячмень) і ў 1950 годзе атрымаць не менш за 60 цэнтнераў з кожнага гектара пры ўмове, калі нават у чэрвені-ліпені месяцах года не будзе ніводнага дажджу. Калі ж будуць праходзіць дажджы, то ўраджай будзе не 60 цэнтнераў з аднаго га, а 70–80 цэнтнераў.

4. Сіламі калгаснікаў і за іх кошт будзе пабудаваны пасёлак на 200 кватэр, кожная кватэра будзе складацца з 2 пакояў, кухні, прыбыральні і невялікага хлява для жывёлы і птушкі калгасніка. Пасёлак будзе ўяўляць з сябе тып добраўпарадкаванага, культурнага пасёлка сярод пладовых і дэкаратыўных дрэў;

5. Артэзіянскіх калодзежаў — 6 штук…

Павінен сказаць, што валавы даход калгаса «Чырвоны партызан» Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці ў 1940 годзе складаў толькі 167 тысяч рублёў.

…Калі па гэтай заяве ўзнікнуць пытанні, прашу выклікаць мяне для тлумачэння.

Герой Савецкага Саюза падпалкоўнік дзяржаўнай бяспекі Арлоўскі.

6 ліпеня 1944 г.

г. Масква, Фрунзенская набярэжная, дом № 10 а, кв. 46, тэл. Г-6-60-46».

Сталін задаволіў просьбу Арлоўскага. Арлоўскі здаў дзяржаве маскоўскую кватэру і з'ехаў у сваю вёску. У студзені 1945 года ён быў выбраны старшынёй калгаса «Рассвет» (так стаў называцца «Чырвоны партызан») Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці.

ВОСЬ як сам Арлоўскі ўспамінае пачатак сваёй дзейнасці:

«Каля абгарэлых хат сабраліся дзеці, старыя, некалькі інвалідаў… На гарызонце відаць кудлатыя хвасты дыму — яшчэ не патушаны пажары ў вызваленым Бабруйску. Беларуская зямля ляжыць у руінах і ў попеле, нічога не ацалела ў Мышкавічах ад ранейшай калгаснай гаспадаркі…

На першым сходзе калгаснікаў шмат было размоў, як пачынаць, за што брацца, да якой справы раней за ўсё прыляпіцца. Самае моцнае, што засталося ў памяці,— ужо тады ў калгаснікаў ярка праявілася пачуццё калектывізацыі, пачуццё адзінай сям'і. Разам з гэтым пачуццём нарадзілася вера, што хутка ўсё зноў наладзіцца».

Пад кіраўніцтвам Арлоўскага калгас «Рассвет» стаў першым у пасляваенным СССР калгасам-мільянерам.

У 1958 г. Арлоўскаму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. За баявыя і працоўныя заслугі ўзнагароджаны 5 ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, шматлікімі медалямі. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР трэцяга-сёмага скліканняў. У 1956–1961 гадах быў кандыдатам у члены ЦК КПСС.

Памёр Кірыла Пракопавіч 13 студзеня 1968 года. Пасля яго смерці калгас «Рассвет» стаў называцца яго імем.

Вось што напісаў пра яго часопіс «Кругозор» у 1969 годзе.

З аповесці «Мяцежнае сэрца»

«У прасторным пакоі, акрамя пісьмовага стала, рады крэслаў чалавек на сто. Тут праходзяць рассветаўскія партыйныя сходы і семінары. Тут прымаюць гасцей, і круглы год а шостай раніцы, а ў час сяўбы ці ўборкі ўраджаю і раней, сюды збіраецца на нараду калгаснае кіраўніцтва. У гэтым пакоі вырашаюцца ўсе вялікія і малыя пытанні. Учора падаў заяву — сёння адказ. Вырашаюцца адкрыта, пры самай шырокай галоснасці і з захаваннем дэмакратычных нормаў.

— Сёння дванаццаць градусаў, барометр стаіць на «ясна». Якія планы, паглядзім,— кажа старшыня Арлоўскі.— Першая брыгада?..

Работа на дзень зацверджана. Кірыла Пракопавіч схіляецца над сталом, чытае заяву. Калгасніца Алена Бяляўская піша, што ў яе несправядліва аднялі восемдзесят шэсць рублёў за недаздзенае насенне агуркоў.

Прачытаўшы заяву, Кірыла Пракопавіч здымае акуляры.

— Дзевяць гадоў таму,— пасля паўзы кажа ён,— прыкладна ў гэты ж час памёр Антон Майсеевіч Бяляўскі. Звычайны стары, начны вартаўнік. Мы лічылі яго самым простым і самым звычайным, пакуль жыў. А калі памёр, убачылі, што душа ў яго была выдатная — выдатная душа патрыёта калгаса «Рассвет». Калгаснае ён любіў усім сэрцам. Чалавекам звацца лёгка, а быць чалавекам — гэта не проста. Антон Бяляўскі быў такім. Думаю, варта паставіць яму помнік.

У задніх радах пачулася хліпанне.

— …А ў Антона Бяляўскага засталася ўдава Алена. Давайце разбяромся, ці справядлівая яна жанчына, альбо яна была Антону не пара, глядзіць, як бы пацягнуць з калгаса, што толькі можна. А ну, раскажы, Алена, якія твае крыўды?

Старая ўстала, змахнуўшы слязу, загаварыла:

— Прывёз мне восенню Сямён жаўцякоў і кажа: «Тут тона». Тона дык тона, я не правярала. Усе вылушчыла, высушыла, як належыць, і здала. І раптам пры канчатковым разліку — восемдзесят шэсць рублёў. Несправядліва гэта. Я працавала і працую добрасумленна…

Слова просіць калгасны бухгалтар Іван Фаміч. Гучна, памятаючы пра слабы слых Арлоўскага, дае дакладную даведку:

— Алена Бяляўская і яе суседка Лізавета Цэд атрымалі па дакументах агуркоў пароўну, а здалі насення… Алена на восемдзесят шэсць рублёў дваццаць капеек менш за норму, а Лізавета — на восемдзесят дзевяць рублёў больш за норму. Агуркі аднолькавыя, з адной машыны.

*— Вы зразумелі, таварышы, у чым справа? — тлумачыць Арлоўскі.— Састарэлым калгаснікам мы даём пасільную працу — яны

■ Занятасць

БУХГАЛТАРАМ І САКРАТАРАМ ПРОСЬБА НЕ ТУРБАВАЦЬ

Рынку патрэбны ўрачы, кіроўцы і аператары машыннага даення

За мінулы год колькасць вакансій у нашай краіне паменшылася на 9 працэнтаў. У асноўным з-за аптымізацыі на прадпрыемствах, якія імкнуцца да эфектыўнага выкарыстання персаналу. Аднак рынку па-ранейшаму не хапае працоўных рэсурсаў. Каго шукаюць наймальнікі і хто можа спадзявацца на высокія заробкі?

СПЕЦЫЯЛІСТЫ ЁСЦЬ, АЛЕ ЯКАСНЫХ ЗНАЙСЦІ СКЛАДАНА

Паводле інфармацыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, сёння налічваецца больш за 33 тысячы вакансій. Атрымліваецца, што на кожнага беспрацоўнага ў краіне прыпадае 1,4 свабоднага месца. Для не занятых у эканоміцы жыхароў Мінска прызапашана па 4 варыянты. Чаму вакансіі не запаўняюцца? Большасць з іх адкрыта ў дэфіцытных катэгорыях. Патрэбны грузчыкі, будаўнікі, работнікі вытворчасці. Гэта персанал з высокай ступенню цякучасці: наўрад ці шмат людзей мараць усё жыццё працаваць рабочымі. Увогуле, даследчыкі рынку вылучаюць тры віды дэфіцыту: па колькасці персаналу (у тых жа лагістычных і гандлёвых цэнтрах, якія хутка растуць), па навыках і ўменнях і па ўнікальных кампетэнцыях, неабходных для пэўнай пасады. Працадаўцы скардзяцца, што не хапае спецыялістаў менавіта па навыках.

На адну вакансію дырэктара прыпадае 4-6 рэзюмэ. Але калі паглядзець на якасць кандыдатаў, то большасць з іх — людзі, якія проста хочуць бачыць сябе кіраўнікамі, часцей без належнага вопыту і ўменняў.

— На рынку большасць людзей маюць пачатковы або сярэдні ўзровень кампетэнцый, — тлумачыць **кіраўнік напрамку «Даследаванні рынку працы» кансалтынгавай групы «Тут і цяпер» Вольга НАДТАЧАЕВА.** — Асабліва гэта заўважна ў адміністрацыйна-кіраўнічай сферы. Напрыклад, на адну вакансію дырэктара прыпадае 4-6 рэзюмэ. Але калі паглядзець на якасць кандыдатаў, то большасць з іх — людзі, якія проста хочуць бачыць сябе кіраўнікамі, часцей без належнага вопыту і ўменняў. У нас шмат юрыстаў, але знайсці таго, хто, акрамя беларускага, ведае брытанскае і шведскае права, вельмі цяжка.

Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях Зінаіды МАНДРОЎСКАЙ**, адна з прычын працанедастатковасці рынку — дысбаланс падрыхтоўкі кадраў:

— Паўплывала масавая вышэйшая адукацыя: чаканні ў маладых людзей зусім іншыя. Да таго ж даступны замежныя рынкі працы. Людзі едуць зарабляць куды-небудзь па суседстве, дзе больш прапаноўваюць, а жывуць тут, пакалькі танней. Ёсць праблема і з размеркаваннем працоўных рэсурсаў. На ўзроўні аграгарадкоў адсутнічаюць свабодныя месцы, і людзі там не заўсёды знаходзяць куды прыкласці свае сілы. Таму на сяле бываюць лішкі працоўных кадраў, а ў гарадах — недахоп.

Цікава, што летась колькасць рэзюмэ ў два-тры разы перавышала колькасць вакансій. Незадаволеныя заробкамі ці іншымі ўмовамі на цяперашнім месцы, людзі пасіўна выходзілі на рынак працы. Яны не спяшаюцца звальняцца, але ўвесь час маніторацца сітуацыю: што цікавага прапаноўваюць і ці не з'явіўся наймальнік, гатовы паабяцаць больш грошай.

«АЙЦІШНІКІ» ПА-РАНЕЙШАМУ Ў ЦАНЕ

Сумная навіна для ўладальнікаў дыпломаў аб вышэйшай адукацыі: 67 працэнтаў свабодных працоўных месцаў прызначаны для рабочых. Хоць попыт на «айцішнікаў» і менеджараў па продажах дагэтуль не задаволены. **Начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТАКУН** упэўнены, што кардынальных структурных змен у банку вакансій не адбудзецца:

— Захаваецца попыт на прадстаўнікоў будаўнічых прафесій, слесараў, токараў, трактарыстаў, санітарак, кухараў, прадаўцоў, афіцыянтаў, швачак. Найменш запатрабаванымі на рынку працы будуць дыспетчары, справаводы, інспектары па кадрах, сакратары, загадчыкі складоў і тэхнікі-тэхнолагі.

Каб ацаніць сітуацыю, заходжу на сайт Агульнарэспубліканскага банка вакансій. Больш за паўтары сотні мінскіх наймальнікаў шукаюць урачоў і медсёстраў. У 120 сталічных арганізацыях патрэбны прыбіральшчыцы. Урачы, кіроўцы і прадаўцы складаюць топ-3 вакансій Гродзеншчыны і Магілёўшчыны. У Мінскай і Брэсцкай абласцях, акрамя згаданых спецыялістаў, неабходны электраманцёры па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання. На Віцебшчыне не хапае каля паўсотні трактарыстаў, а на Гомельшчыне гатовы працаўладкаваць 41 аператара машыннага даення. Апошняя вакансія, трэба сказаць, папулярная ў многіх рэгіёнах. Праўда, жаданні працадаўцаў і суіскальнікаў супадаюць толькі па адной спецыяльнасці — кіроўца. Нягледзячы на папяроджанні аналітыкаў рынку аб лішку прадстаўнікоў пэўных прафесій, людзі працягваюць актыўна шукаць месцы юрыстаў, бухгалтараў, эканамістаў і сакратароў.

Дарэчы, тэма «паспрабую шчасця за мяжой» у беларусаў па-ранейшаму папулярная. Згодна са звесткамі Дэпартамента грамадзянства і міграцыі МУС, у 2014 годзе амаль пяць з паловай тысяч жыхароў нашай рэспублікі паехалі зарабляць у іншыя краіны. Сапраўдная лічба, вядома, большая: колькасць неафіцыйных «гастарбайтараў» статыстыка не назаве. Для працы часцей выбіраюць Расію (туды накіраваліся 4 тысячы 784 чалавекі), ЗША, Германію, Польшчу. Колькі з іх рэалізавалі «амерыканскую мару» (неабавязкова ў Штатах)? Думаю, адзінкі. Дзве траціны працоўных эмігрантаў уладкоўваюцца на рабочыя спецыяльнасці, яшчэ 18 працэнтаў задзейнічаны ў сферы абслугоўвання.

СЭРВІСНЫЯ СФЕРЫ — САМЫЯ ЎРАЗЛІВЫЯ ПАДЧАС КРЫЗІСУ

Хто з спецыялістаў за мінулы год вырас у цане? Самыя заўважныя змены ўзроўню прыбыткаў адбыліся ў работнікаў дэфіцытных галін: транспарту, лагістыкі, сферы бяспекі. Іх заробкі выраслі на 37 працэнтаў (на 12 працэнтаў больш, чым у сярэднім па рынку). Значныя павышэнні назіраліся і ў аплаце спецыялістаў будаўніцтва, вытворчасці, кіравання якасцю.

Цікавая тэндэнцыя: пры разліку заробкаў толькі чвэрць арганізацый надае ўвагу пытанню стажу працы на пэўнай пасадзе.

— Стаж не раўняецца эфектыўнасці працы. Пры прэміраванні работнікаў кампанія арыентуецца на выкананне планаў, якасць і тэрміны іх рэалізацыі. Потым улічвае індывідуальную паспяховасць кожнага з супрацоўнікаў. Стаж, хутчэй, уплывае на фарміраванне сацыяльнага пакета ці льгот. Быў выпадак, калі сакратарка атрымлівала больш за начальніка вытворчасці, таму што прапрацавала 25 гадоў у Мінскім раёне на гэтай пасадзе. Зразумела, сакратар — пазіцыя важная, але на ёй не павінны плаціць больш, чым топаваму работніку вытворчасці, — каментуе Вольга Надтачаева.

Прывязка да долара для нашых працадаўцаў не актуальная. Наймальнікі больш арыентуюцца на сітуацыю на мясцовым рынку, на заробкі ў кампаніях-канкурэнтах. Аднак беларусы, што працуюць на топ-пасадах ці ў прыбыткаўтваральных падраздзяленнях, могуць разлічваць, што іх заработная плата хутчэй наблізіцца да доларавага эквіваленту. У крызіс прадпрыемствы заўсёды стараюцца захаваць касцяк, які і можа трымаць у стабільнасці бізнес. А вось сэрвісныя сферы, такія як бухгалтэрыя, маркетынг, юрыспрудэнцыя, традыцыйна самыя ўразлівыя ў перыяд нестабільнасці на рынку.

Праўда, імкненне атрымліваць больш незалежна ад стану эканомікі прывяло да таго, што на працягу 4—5 гадоў рост заробкаў апярэджваў прадукцыйнасць працы. Тым, хто заняты на стратных прадпрыемствах, прыйдзецца сур'ёзна папрацаваць. На думку Зінаіды Мандроўскай, у нашых арганізацый дастаткова варыянтаў, як павысіць сваю эфектыўнасць. Мадэрнізацыя, штатная расстаноўка — задача любога кіраўніка. Безумоўна, у цяперашняй сітуацыі — з-за страты рынкаў збыту і інфляцыі — вытрымаць належны рэжым працы складана. Але магчыма. Каб захаваць заробкі, трэба думаць, як зменшыць выдаткі на вытворчасць: напрыклад, скарачаць матэрыяльныя і энергарэсурсы, занятыя плошчы.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

■ Супраць наркотыкаў

«Трэба цалкам ізаляваць дзіця ад стасункаў з наркаманам»

Як збіць хвалю папулярнасці спайсаў

На жаль, не ўсе мерапрыемствы, якія праводзяцца для прафілактыкі распаўсюджвання наркаманіі, прыносяць карысць. Многія — шкоду. Так лічыць начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый МАРКЕВІЧ. Ён падзяліўся сваімі меркаваннямі наконт увядзення ў дзеянне Дэкрэту № 6 «Пра неадкладныя меры па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў».

— Чаму можа навучыць былы наркаман «у масцях», якога запрасілі на сустрэчу ў адну са школ да старшакласнікаў? Між іншым, і самі маладыя людзі адмоўна адносяцца да такіх сустрэч. Думаю, мы прыйдзем да навукова абгрунтаваных метадаў прафілактыкі. Пры гэтым абавязкова трэба ўлічваць падлеткавую псіхалогію, якая значна адрозніваецца ад псіхалогіі дарослых людзей. Не заўсёды тыя гутаркі, што праводзяць з дзецьмі настаўнікі, медыкі, супрацоўнікі праваахоўных органаў, прыносяць карысць.

Дарэчы, палкоўнік Маркевіч адзначыў, што на Гомельшчыне добра зарэкамендавалі сябе маладзёжныя антынаркатычныя атрады. Менавіта таму прынята рашэнне распаўсюджваць вопыт іх работы ва ўсіх вышэйшых навучальных установах рэспублікі. Прынцып «роўны навучае роўнага» эфектыўна працуе ў справе прафілактыкі наркаманіі.

Між тым, праведзенае анкетаванне непаўналетніх ва ўсіх выпускных класах школ Гомельскай вобласці паказала, што 3% школьнікаў спрабавалі наркотыкі. Пры гэтым падлеткі адзначылі, што больш давяраюць бацькам, чым спецыялістам.

— Што рабіць, калі ў кампаніі сяброў ёсць наркаман? — агучвае распаўсюджанае пытанне бацькоў Юрый Сяргеевіч. — Як бы гэта ні негуманна гучала, лічу, што трэба цалкам ізаляваць сваё дзіця ад стасункаў з ім. Бо наркаман рана ці позна прапануе іншым паспрабаваць атруту. Лепш за ўсё адразу звярнуцца ў органы ўнутраных спраў і такім чынам выратаваць іншых дзяцей.

Сапраўды, толькі сваякі першымі могуць заўважыць змены ў паводзінах, вучобе, звычках дзіцяці. А яшчэ ў тым, што ў яго немаведама адкуль з'явіліся вялікія грошы. Дарэчы, менавіта тых, каму яшчэ не споўнілася 16 гадоў, уладальнікі інтэрнэт-наркакрам часта выкарыстоўваюць у якасці чарнавой рабочай сілы: прыцягнуць дзяцей да адказнасці за тое, што яны рабілі «закладкі» ў тайнікі, да 1 студзеня было нельга. Цяпер адказнасць наступае з 14 гадоў і падлетак за ўдзел у злачынстве, звязаным з наркотыкамі, можа атрымаць тэрмін да 25 гадоў пазбаўлення волі.

— Так, санкцыі сталі больш жорсткімі, — адзначае Юрый Сяргеевіч. — Калі праз дзеянні наркавытворцы ці наркараспаўсюджвальніка, нават і па неасцярожнасці, загінуў ад перадазіроўкі чалавек, тэрмін пазбаўлення волі будзе максімальным. Мы разлічваем, што многія задумаюцца. Тыя вялікія грошы, якія некаторыя маладыя людзі атрымліваюць ад збыту наркотыкаў, не вартыя 25 гадоў, праведзеных за кратамі. Калі звярнуцца да гісторыі, у 2000 годзе атрымалася стабілізаваць становішча толькі дзякуючы ўзмацненню жорсткасці санкцый. Мы спадзяёмся, што гэта прыпыніць тых, хто разлічваў на беспакаранасць.

Дарэчы, прыклады, якія прыводзіць Юрый Сяргеевіч, сведчаць: пра наркабізнес аднаго з членаў сям'і звычайна ведаюць усе яго сваякі, упэўненыя, што іх, такіх разумных, «не вылічаць» праваахоўнікі. Вылічваюць, нягледзячы на тое, што зараз прынцыпова змяніліся метады распаўсюджвання наркаатруты. Так летась супрацоўнікі новага спецыялізаванага падраздзялення ва ўпраўленні, што ўзначальвае Юрый Маркевіч, на Гомельшчыне спынілі дзейнасць чатырох інтэрнэт-крам, праз якія спайсы прадаваліся бескантактным спосабам:

— Тым разам мы затрымалі ўсё: тэхніку, наркотыкі і 55 «закладак», прыгатаваных для рэалізацыі. Дарэчы, уладальнікі апошняй з выяўленых інтэрнэт-наркакрам выказалі ўдзячнасць, што іх затрымалі ў снежні, а не ў студзені, калі адказнасць па «іх» артыкулах была б куды больш жорсткай.

Таксама на тэрыторыі Гомельскай вобласці выяўлены дзве лабараторыі па вытворчасці псіхатропных рэчываў. Злачынцы той, дзе вырабляўся амфетамін, добра канспіраваліся і нават імкнуліся не пакідаць ніякіх слядоў на Радзіме. Ніводнага грама не прадалі на тэрыторыі Беларусі — усё вывозілі ў Расію. Але і гэта не дапамагло ім пазбегнуць адказнасці.

Пра наркабізнес аднаго з членаў сям'і звычайна ведаюць усе яго сваякі, упэўненыя, што іх, такіх разумных, «не вылічаць» праваахоўнікі. Вылічваюць.

Прынамсі, жудасны выпадак у Гомелі, калі двое сяброў «пад кайфам» выкалалі вочы трэцяму ў тым жа стане, спрацаваў на карысць прафілактыкі ўжывання наркотыкаў. Праваахоўнікі, якія адсочваюць водгукі моладзі на розныя паведамленні ў інтэрнэт-прасторы, канстатуюць: менавіта пасля агучвання падрабязнасцяў трагедыі кардынальна змянілася стаўленне падлеткаў да наступстваў ужывання спайсаў. Раней пісалі каментарыі кшталту: «спайсы — нічога страшнага», пасля — ніводнай станоўчай рэплікі.

Дэкрэт уводзіць даўно чаканы праваахоўнікамі тэрмін «базавая формула» наркарэчыва. Гэта значыць: у вытворцаў знікае магчымасць пазбегнуць адказнасці пры «дызайнерскім» змяненні хімічнай формулы сумніўнага зелля.

Мой суразмоўца гаворыць, што летась атрымалася збіць хвалю папулярнасці спайсаў, і тым не менш, называе аператыўнае становішча складаным. Калі ў 2013 годзе па лініі барацьбы з незаконным абаротам наркотыкаў было выяўлена 716 злачынстваў, то летась — 1041. Адпаведна павялічылася і колькасць асуджаных: з 451 да 685 чалавек.

— Праблема не дзесьці далёка — яна побач з намі, — падкрэслівае Юрый Маркевіч. — І важна, каб кожны, хто ведае канкрэтныя выпадкі, імкнуўся спыніць свайго сваяка, суседа ці знаёмага.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь па пытаннях супрацьдзеяння незаконнаму абарачэнню наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў або аналагаў

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *15 студзеня 2015 года*
Ухвалены Саветам Рэспублікі *15 студзеня 2015 года*

Артыкул 1. Унесці ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 76, 2/50; 2003 г., № 8, 2/922; 2006 г., № 111, 2/1242; 2008 г., № 1, 2/1388; 2011 г., № 4, 2/1775; Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.07.2012, 2/1960) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. Частку 2 артыкула 27 дапоўніць пунктам 17^1 наступнага зместу:

«17^1) незаконнае абарачэнне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў або аналагаў (часткі 2—5 артыкула 328);».

2. Частку 1 артыкула 57 пасля слова «чалавека» дапоўніць словамі «альбо з незаконным абарачэннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў або аналагаў».

3. Пункт 4 часткі 2 артыкула 115 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4) за асабліва цяжкае злачынства, звязанае з наўмысным замахам на жыццё чалавека альбо з незаконным абарачэннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў або аналагаў, — дванаццаці гадоў.».

4. Частка 3 заўвагі да артыкула 327 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«3. Пад аналагамі наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў у артыкулах гэтага Кодэкса маюцца на ўвазе хімічныя рэчывы, структурныя формулы якіх утвораны заменай у структурных формулах наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або базавых структурах аднаго або некалькіх атамаў вадароду на замяшчальнікі атамаў вадароду, уключаныя ў пералік замяшчальнікаў атамаў вадароду ў структурных формулах наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або базавых структурах, вызначаны Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь.».

5. У артыкуле 328:

у частцы 3:

у абзацы першым словы «або ў месцы правядзення масавых мерапрыемстваў» замяніць словамі «, лячэбна-працоўным профілакторыі, у месцы правядзення масавага мерапрыемства альбо заведама непаўналетняму»;

у абзацы другім слова «трынаццаці» замяніць словам «пятнаццаці»;

частку 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 2 або 3 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай альбо спалучаныя з вырабам ці перапрацоўкай наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў або аналагаў з выкарыстаннем лабараторнага посуду або лабараторнага абсталявання, прызначаных для хімічнага сінтэзу, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.»;

дапоўніць артыкул часткай 5 наступнага зместу:

«5. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 2—4 гэтага артыкула, якія прывялі па неасцярожнасці да смерці чалавека ў выніку спажывання ім наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў, —

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дванаццаці да дваццаці пяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.».

6. Дапоўніць Кодэкс артыкуламі 328^1 і 328^2 наступнага зместу:

«Артыкул 328^1. Незаконнае перамяшчэнне праз Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў або аналагаў

1. Незаконнае перамяшчэнне праз Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў або аналагаў пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 228 гэтага Кодэкса, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

2. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, учыненае групай асоб па папярэдняй змове, альбо паўторна, альбо асобай, якая раней была асуджана за злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, альбо ў дачыненні асабліва небяспечных наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, альбо ў дачыненні наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў у буйным памеры, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткамі 1 або 2 гэтага артыкула, учыненае арганізаванай групай, —

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дванаццаці гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Артыкул 328^2. Спажыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў у грамадскім месцы або з'яўленне ў грамадскім месцы або знаходжанне на працы ў стане, выкліканым ужываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў

Спажыванне без прызначэння ўрача наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў у грамадскім месцы альбо спажыванне іх аналагаў у грамадскім месцы, а таксама з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане, выкліканым ужываннем без прызначэння ўрача наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў ці спажываннем іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў, якое абражае чалавечую годнасць і грамадскую мараль, альбо знаходжанне на працоўным месцы ў працоўны час у стане, выкліканым ужываннем без прызначэння ўрача наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў ці іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў, якое абражае чалавечую годнасць і грамадскую мараль, альбо знаходжанне на працоўным месцы ў працоўны час у стане, выкліканым ужываннем без прызначэння ўрача наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў ці іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, —

караюцца штрафам, або арыштам, ці абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.».

7. Артыкул 332 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 332. Прадастаўленне памяшканняў, арганізацыя альбо ўтрыманне прытонаў для вырабу, перапрацоўкі і (або) спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў або іншых адурманьваючых рэчываў

1. Прадастаўленне памяшканняў для вырабу, перапрацоўкі і (або) спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў або іншых адурманьваючых рэчываў —

караецца арыштам, ці абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

2. Арганізацыя альбо ўтрыманне прытонаў для вырабу, перапрацоўкі і (або) спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў або іншых адурманьваючых рэчываў —

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў са штрафам або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам.».

Артыкул 2. Гэты Закон уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА
29 студзеня 2015 года, г. Мінск № 245-3

■ Такое жыццё

ДРАМА АДНОЙ СЯМ'І

Калі ад любові да нянавісці блізкіх людзей — адзін крок

У адной кватэры жыла-была сям'я: маці, сын з жонкай і двума дзецьмі — старэйшай дачкой і дзесяцігадовым сынам. Стаялі ў чарзе на будаўніцтва, бо мелі патрэбу ў павелічэнні жылплошчы. Пабудаваліся. Атрымалі ключы. Дачка выйшла замуж. На гэтым шчаслівыя моманты ў гэтай не казачнай гісторыі заканчваюцца.

«АБАРОНЫ Ў МЯНЕ НЯМА»

— 29 ліпеня мы выпісаліся са старой кватэры і прапісаліся ў новапабудаванай, каб атрымаць дакументы і аформіць крэдыт, — распавядае маці дваіх дзяцей Наталля Зязюльчык. — Але да вясны планавалі жыць па старым адрасе, пакуль сын ходзіць у школу, бо ні фізічна, ні матэрыяльна немагчыма зрабіць там за кароткі час рамонт.

Кватэра, па словах жанчыны, абсалютна пустая: голыя сцены і, даруйце за падрабязнасці, унітаз. Ды і школы ў тым раёне яшчэ няма. Так і вырашылі, што сын давучыцца, а бліжэй да лета можна будзе распачаць рамонт. Але здзяйсненню гэтых планаў перашкодзілі абставіны. Наталля расказвае, што нечакана да свекрыві вярнуўся былы муж, бацька яе мужа, які 30 гадоў таму развёўся з ёй і сыйшоў у іншую сям'ю.

— Увесь час, колькі мы тут жывем — з 1990 года, ён не падаваў на сябе звестак. А як толькі мы выпісаліся, дзядуля аб'явіўся. Ён не прапісаны ў гэтай кватэры і не развёўся з той сваёй жонкай, але прыйшоў сюды жыць.

І ўсё б нічога, але навааўлены свёкар пачаў папракаць Наталлю, што тая 25 гадоў пражыла ў яго кватэры, і пагражаць, што выкіне яе рэчы. Жанчына мяркуе, што той мае свой інтарэс: трэба пакінуць жылплошчу для дачкі ад другога шлюбу.

Непаўналетняе дзіця зімой пасярод навучальнага года сваякі пакідаюць на вуліцы, і нікому да гэтага няма ніякай справы.

— Ён разбурыў адну сям'ю, пасля другую і цяпер прыйшоў бурыць нашу, — не хаваючы горычы, кажа Наталля. — За год, пакуль ён тут жыве, у нас усё памянялася так, што мы з мужам ужо разводзімся. Бо раптам высветлілася, што я вяду амаральны лад жыцця, не даглядаю сына і толькі хаджу па рэстаранах.

Стаміўшыся цярпець пагрозы, Наталля звярнулася да ўчастковага, каб той правёў са сваякамі прафілактычную размову. Праз некаторы час прадстаўнік аховы правапарадку паведаміў Наталлі, што размова адбылася і да вясны яны могуць спакойна жыць у гэтай кватэры. Аднак нечакана жанчына з сынам Ільёй апынулася ў прамым сэнсе на вуліцы.

— Нічога нам не сказаўшы, яны памянялі замкі ў кватэры. Мы нічога не падазравалі. Ну, чулі размовы пра гэта, але ж ён (свёкар. — **Аўт.**) пастаянна нас выганяў. Аднак я не магла падумаць, што яны змогуць выкінуць на вуліцу ўласнага непаўналетняга ўнука. А тут дзіця прыйшло пасля заняткаў дадому і не змагло трапіць у кватэру.

Наталля спачатку падумала, што ў сына проста не атрымліваецца адчыніць дзверы, але калі прыехала і пераканалася, што і ў яе нічога не атрымліваецца, сумневы адпалі. Жанчына выклікала міліцыю, але дзверы праваахоўнікам не адчынілі. Міліцыянеры, у сваю чаргу, патлумачылі, што свякроў мае права памяняць замок, бо яна гаспадыня кватэры, а ламаць дзверы яны права не маюць, бо жанчына з дзіцем на гэтай жылплошчы ўжо не прапісаны. Калі нарэшце Наталлі з участковым удалося сустрэцца са сваячкай, тая сказала, што нявестка тут ужо паўгода не жыве. Дзверы жанчына так і не адчыніла: не дапамаглі нават угаворы ўчастковага, які заклікаў не пакідаць унука на вуліцы. «Рабіце, што хочаце, мне ўсё роўна», — быў адказ «бабулі».

У Наталлі і дзесяцігадовага Ільі ў кватэры засталася ўся маёмасць — адзенне, падручнікі, ежа, мэбля... а таксама ключы ад новай кватэры. Па яе словах, сваякі не пускаюць жанчыну з сынам у жылое памяшканне і яны не могуць нават забраць неабходныя ім рэчы.

Пакольку кнігі засталіся дома пад замком, Ілья не змог пайсці ў школу. Наталля патэлефанавала класнай кіраўніцы і патлумачыла сітуацыю. Настаўніца звязалася са школьным псіхолагам, які запрасіў бацькоў Ілы на размову. Адметна, што Уладзімір прыйшоў на сустрэчу з... бацькам. Праўда, праз некаторы час ён усё ж прывёз сынавы падручнікі і форму для заняткаў каратэ.

— Я напісала заяву ў міліцыю, што зайду ў кватэру толькі пры іх суправаджэнні. У мяне там грошы, каштоўнасці — усё маё жыццё з 1990 года. Мы жылі нармальна, пакуль не з'явіўся сужыцель свекрыві, — жанчына ўсё яшчэ не можа ўсвядоміць, што такая сітуацыя магла здарыцца ў яе сям'і.

Аднак размова ў міліцыі паказала, што і тут жанчыне і яе сыну дапамагчы нічым не могуць. Маўчаць і органы адукацыі. Пакуль жанчына з дзіцем жывуць на здымнай кватэры, але што рабіць далей — невядома. Наталля прызнаецца, што ў шоку ад таго, што робіцца: непаўналетняе дзіця зімой пасярод навучальнага года сваякі пакідаюць на вуліцы, і нікому да гэтага няма ніякай справы.

— Яны ўтраіх, а я адна з дзіцем, і абароны ў мяне няма, — у скрусе гаворыць жанчына.

«ЯНА САМА НЕ ХАЦЕЛА ЗАБІРАЦЬ КЛЮЧЫ»

Ва ўсёй гэтай сітуацыі лагічна паўстае пытанне: а што муж жанчыны і бацька дзіцяці, якім заблакавалі доступ у кватэру? Уладзімір Зязюльчык падзяліўся са «Звяздой» сваім поглядам на тое, што здарылася.



Мужчына распавядае, што новую кватэру сям'я атрымала яшчэ ў маі, але дасюль яна стаіць пустая, бо, па яго словах, жонка адмаўлялася супольна рабіць рамонт:

— Колькі разоў я даваў ёй ключы ад кватэры, але яна не хацела іх браць! Цяпер яна прыкрываецца непаўналетнім дзіцем і хоча, каб я цалкам за свой кошт зрабіў рамонт, а яна там жыла.

Уладзімір расказвае, што праблемы ў сям'і з'явіліся не знянацку, а цягнуцца ўжо дзесяць гадоў. Менавіта тады мужчына першы раз падаў на развод. Аднак жаданне захаваць сям'ю перамагло. Праўда, цяпер, па словах Уладзіміра, яго цярпенне лопнула. Да такой ступені, што, не дачакаўшыся разводу, у кватэры памянялі замкі і пакуль яшчэ законная жонка з дзіцем апынулася на вуліцы.

— У яе бацькоў ёсць дом з усімі выгодамі, але там яна жыць не хоча, — абвяргае Уладзімір тое, што жанчыне няма куды падацца. — Мае бацькі сказалі, што мяне з дзіцем яны ў кватэру пусцяць, а яе (Наталлю. — **Аўт.**) бачыць не хочуць. Мая маці яе баіцца.

Між тым, мужчына пацвярджае, што да нядаўняга часу ўся сям'я жыла разам у адной кватэры. Аднак жонка, па яго словах, не плаціла за камунальныя паслугі, не хацела ўкладвацца ў рамонт новай кватэры і толькі цягам апошніх чатырох месяцаў аплачвае палову крэдыту (Наталля сцвярджае, што за крэдыт і камунальныя плаціць яна). Аднак да лёсу дзіцяці ён усё ж неабыякавы:

— Цяпер я раблю пакой для сына ў новай кватэры, шпаклюю сцены, шпалеры буду клеіць. Мэблю прывязём са старой кватэры — і ложак, і ўсё ёсць. А ключы я ўжо думаю проста перадаць участковаму, каб той аддаў іх жонцы.

***

Многія сем'і не вытрымліваюць выпрабаванняў побытам, грашыма, кватэрным пытаннем, ды і многімі нематэрыяльнымі рэчамі. Вядома, з той ці іншай прычыны ў кожнай сям'і бываюць свае крызісы. І ні журналісты, ні бацькі, ні суседзі, ні хто іншы не мусяць лезці ў гэтыя справы: сужэнцы павінны высвятляць адносіны паміж сабой самастойна. Аднак самае прыкрае ва ўсёй гэтай і тысячах іншых падобных сітуацый тое, што мімаволі іх ахвярамі становяцца дзеці. Яны не павінныя ў тым, што Бог не даў іх бацькам мудрасці разабрацца са сваімі праблемамі цывілізавана, аднак перажываюць не менш за вас, паважаныя дарослыя. Проста часам трэба спыніцца і падумаць, што для вас галоўнае: уласны эгаізм ці тыя, хто побач і любіць вас усім сваім маленькім сэрцам.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

Краіна здароўя

Выпуск № 2 (332)

■ Доктар адкажа

ТАКІ ВЫСОКІ БІЛІРУБІН

«Падкажыце, калі ласка, з якой прычыны можа быць павышаны ўзровень білірубіну ў крыві?

Алена, г. Барысаў».

Тлумачыць **загадчыца аддзялення прафілактыкі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Ірына ЕЎДАКІМАВА:**

— Білірубін — гэта пігмент жоўта-карычневага колеру, які выпрацоўваецца ў многіх органах і тканках. З'яўляецца прадуктам распаду гемаглабіну і некаторых іншых бялкоў у клетках печані, касцявога мозгу і селязёнкі.

У нашым арганізме білірубін прысутнічае ў дзвюх формах — прамы (звязаны) і непрамы (свабодны). Агульны білірубін у чыстым выглядзе не існуе, вызначаецца яго сумарная колькасць.

У дарослых узровень агульнага білірубіну ў крыві складае 8,5–20,5 мкмоль/л.

Непрамы дапускаецца да 15,4 мкмоль/л (75% ад агульнага), прамы — да 5,1 мкмоль/л (25% ад агульнага).

Пры нармальным білірубінавым абмене ў кроў трапляе вельмі нязначная колькасць прамога білірубіну. Аднак пры паталогіі яго канцэнтрацыя можа значна ўзрастаць як у крыві (гіпербілірубінемія), так і ў мачы (білірубінурыя), пранікаць у навакольныя тканкі і выклікаць пажаўценне скуры, склер і слізістых. Акрамя таго, на захворванне можа ўказваць млосць, слабасць, ваніты, горкая адрыжка, цяжар у правым падрабрынні, амаль без колеру, белы кал, мача колеру піва і скураны сверб.

Сярод асноўных прычын парушэння білірубінавага абмену —

- хваробы крыві (гемалітычныя анеміі, уздзеянне таксічных і хімічных рэчываў на клеткі крыві);
- хваробы печані (вірусныя, бактэрыяльныя, аўтаімунныя, таксічныя і лекавыя гепатыты, жаўтуха);
- атручэнне алкаголем, хімікатамі і медыкаментамі;
- жоўцекаменная хвароба, дыскінезія жоўцевага пузыра, панкрэатыт;
- спадчынны недахват ферменту печані — сіндром Жыльбера;
- недахоп вітаміну B^{12}.

Знізіць білірубін можна, але для гэтага трэба ведаць прычыну яго павышэння. Інакш ён і далей будзе павышацца, бо павышэнне ўзроўню прамога білірубіну ў крыві з'яўляецца не асобным захворваннем, а адным з сімптомаў нейкай хваробы. Калі высветліцца, што ва ўсім вінаваты застой жоўці, то дастаткова будзе выдаліць камень у жоўцевым пузыры або правесці курс лячэння прэпаратамі, якія паляпшаюць аддзяленне жоўці. Пры вірусных гепатытах патрабуецца антывірусное лячэнне, пры гемалітычнай анеміі — сродкі, якія папярэджваюць павышаны распад эрытрацытаў. Калі ж прычына звязана з інтаксікацыяй арганізма, дапаможа ўжыванне адсарбентаў, якія звязваюць таксічныя рэчывы, і гепатапратэктараў, якія абараняюць печань. Акрамя таго, для зніжэння паказчыка ферменту ў крыві неабходна максімальна разгрузіць печань і жоўцевы пузыр, для чаго перагледзець рацыён харчавання. З меню трэба выдаліць вострыя, вэнджаныя і смажаныя стравы, газіраваныя напоі, алкаголь, моцны чай, салодкае. Трэба аддаць перавагу свежым, вараным ці запечаным прадуктам, асабліва гародніне, што дапаможа пазбавіцца запораў, адновіць карысную мікрафлору і забяспечыць хуткі вывад таксінаў з кішэчніка. Для нармальнай работы страваваль нага тракта харчавацца трэба часта і пакрысе, не пераядаць і не дапускаць працяглых перапынкаў паміж прыёмамі ежы. Забараняюцца галодныя дыеты для пахудзення, паказана лячэбная дыета пры жоўцекаменнай хваробе.

Як правільна здаць аналіз крыві?

Кроў бярэцца раніцай нашча. Не рэкамендуецца цягам 8 гадзін да працэдуры піць каву — кафеін зніжае ўзровень білірубіну, а значыць, вынікі даследавання будуць недакладнымі.

Небяспечна!

Высокі ўзровень білірубіну патрабуе ўважлівага стаўлення і строгага кантролю, паколькі ён надзвычай таксічны для цэнтральнай нервовай сістэмы і выклікае шэраг непрыемнасцяў — стойкі галаўны боль, упадак сіл, рэдкі пульс (брадзікардыя).

Лепшы спосаб пазбегнуць інтаксікацыі галаўнога мозга і ўсяго арганізма — звярнуцца да ўрача пры першых нездаровых сімптомах.

■ Ваш ціск

«Маўклівы забойца»

Вялікая небяспека падкрадваецца незаўважна

Многія нават не ведаюць, што ў іх павышаны ціск, другія ведаюць, але ставяцца да гэтага легкадумна і не жадаюць лячыцца, таму што «нармальна сябе адчуваюць», а трэція лечацца, але няправільна і нерэгулярна. Аднак артэрыяльную гіпертэнзію нездарма называюць «маўклівым забойцам». Шмат гадоў яна пашкоджвае сэрца і сасуды і, калі не правадзіць своечасовае лячэнне, вядзе сваю ахвяру да інсульту, інфаркту, страты зроку, ныркавай недастатковасці, слабасці сардэчнай мышцы.

Гіпертанія развіваецца ў 6 разоў часцей у тых, хто харчуецца нерацыянальна, злоўжывае тлустай і салёнай ежай, алкаголем, мае лішнюю вагу. Стрэсавыя сітуацыі, асабліва неадэкватная рэакцыя на іх, таксама адносяцца да неспрыяльных для здароўя фактараў.

Незалежна ад узросту кантралюйце артэрыяльны ціск.

Калі ціск у вас не павышаўся ніколі, то 2 разы на год.

Калі павышаны ціск быў хоць аднойчы, то не радзей за 1 раз на месяц.

Калі ціск павышаецца, і вы не адчуваеце гэтага, то 1 раз на тыдні.

Калі павышэнне ціску суправаджаецца парушэннем самаадчування, кантроль артэрыяльнага ціску праводзіцца так часта, як гэта параіць доктар.

Пачніце з таго, што мерайце ціск цягам тыдня раніцай і ўвечары.

Урач-кардыёлаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Людміла ВАСІЛЕВІЧ тлумачыць, як мераць ціск правільна.

✓ Толькі ў становішчы седзячы, пасля 5-хвіліннага адпачынку.

✓ Манжэтка танометра павінна знаходзіцца на ўзроўні сэрца.

✓ Цягам гадзіны не ўжывайце каву, моцны чай, не курыце.

✓ Паўтарыце вымярэнне не менш за 2 разы з інтэрвалам 3–5 хвілін.

✓ Запішыце ў свой «дзённік здароўя» дату, час і атрыманыя даныя.

У норме артэрыяльны ціск не павінен перавышаць 140/90 мм рт. сл. (у падлеткаў ён складае 120/80 мм рт. сл.) Значэнні могуць часова мяняцца ў той ці іншы бок на 10–15 мм рт. сл. нават у здаровых людзей — пры хваляванні, фізічнай нагрузцы, пасля ўжывання кавы і ў спакоі.

Вызначыце свой вагавы індэкс паводле формулы: вага/рост у $м^2$. Напрыклад, вага 62 кг, рост — 160 см. Індэкс — 62:1,62=24,2 $кг/м^2$. Норма — 18,5–25 $кг/м^2$. Калі ў вас атрымалася больш, трэба перагледзець рацыён харчавання:

1) знізіць каларыйнасць ежы за кошт салодкага, цукру, здобнай выпечкі, жывёльных тлушчаў, тлустага мяса, сыру;

2) не ўжываць моцныя чай і каву, насычаныя рыбныя і мясныя булёны, салодкія газіраваныя напоі;

3) больш ужываць раслінных прадуктаў (200 г садавіны і 200 г агародніны штодня);

4) уключаць у рацыён прадукты, багатыя на солі калію (разынкі, чарнасліў, курагу, бульбу, арэхі, агародніну, крупы, нятлусты тварог) і на солі магнію (бабовыя, свежае зяленіва, моркву, шыпшыну, інжыр, фінікі, арахіс);

5) калі і піць сокі, то найперш яблычны і грэйпфрутавы, а нагул штодня трэба ўжываць не менш за 1,5 л вадкасці;

6) харчавацца дробнымі порцыямі — 3–4 разы на дзень, так, каб апошні прыём ежы быў не пазней за 19 гадзін, а інтэрвал паміж вячэрай і сняданкам не перавышаў 12 гадзін;

7) не заахвочваць дзяцей ежай, а самім ніколі не «заядаць» дрэнны настрой;

8) паколькі «перасол» ежы спрыяе развіццю артэрыяльнай гіпертэнзіі, ужываць мінімум хатніх саленняў і марынадаў, адмовіцца ад салёных арэшкаў і чыпсаў, селядца. Уся сям'я павінна арыентавацца на недасол. Мала солі змяшчаюць агародніна, крупы, садавіна, малако, тварог, свежая рыба і мяса. У каўбасе, дарэчы, яе можа быць разоў у дзесяць больш, чым у мясе.

Рэгулярныя фізічныя нагрузкі прыводзяць да зніжэння артэрыяльнага ціску. Асабліва карысныя ранішняя гімнастыка, штодзённая хада ў сярэднім тэмпе цягам 40–60 хвілін, плаванне 3–4 разы на тыдні, рытмічная гімнастыка, катанне на лыжах або веласіпедзе. Не рэкамендуюцца пад'ём цяжару, хуткі бег, крос, хада на лыжах або плаванне ў хуткім тэмпе, розныя віды барацьбы і спаборніцтвы.

Нікацін выклікае спазм сасудаў, зніжае іх эластычнасць, што павышае ціск. Адмова ад курэння можа нармалізаваць ціск — як і адмова ад ужывання алкаголю (у любой форме і колькасці тым, каму няма 20 гадоў).

Канфлікты, асабліва працяглыя, цяжкавырашальныя, спрыяюць павышэнню артэрыяльнага ціску. Неабходна вучыцца мяняць сваё стаўленне да навакольля, праяўляць цярплівасць і добразычлівасць. У сям'і павінен быць ашчадны псіхаэмацыянальны клімат. Вучыцеся расслабляцца і кіраваць сваімі эмоцыямі, райцеся з псіхолагам.

Простымі сродкамі

На пачатку развіцця артэрыяльнай гіпертэнзіі выкарыстоўваюць немедыкаментозныя метады лячэння — масаж, іголкаўколванне, водныя працэдуры (кантрасны душ, саўна, ванны). Рэкамендуюцца лекавыя расліны: трава сардэчніку, плады глогу, рабіны, кропу, шыпшыны, лісце брусніц, чарніц, мяты, трава сушаніцы, корань валяр'яну.

Разам з арганізацыяй рэжыму жыцця, харчавання, дастатковай рухальнай актыўнасцю на працягу 4–6 месяцаў можна нармалізаваць артэрыяльны ціск. Калі паказчыкі не прыйшлі да нормы, прызначаюць лекі для працяглага прыёму, часам на ўсё жыццё, паколькі захворванне высокая рызыка развіцця ўскладненняў, якія, у сваю чаргу, могуць прывесці да інваліднасці і гібелі.

Поспех у лячэнні залежыць толькі ад вашага перакананння ў неабходнасці лячэння, пры гэтым размова ідзе не пра нейкі курс, а пра доўгатэрміновую праграму.

■ Карысныя напоі

ДОМА — ЧАЙ, У ГАСЦЯХ — КАВА

Існуе мноства даследаванняў аб спрыяльным уздзеянні абодвух гэтых напояў. Даследчыкі і спажыўцы зноў і зноў цікавяцца тэмай з прыемным водарам ды смакам. Дык што піць будзем — чай? Або каву? Кажуць, кава павышае бадзёрасць, садзейнічае страваванню, спрыяльна ўплывае пры захворваннях Альцгеймера і дыябеце… Навукова гэта, праўда, пакуль не пацверджана.

АГУЛЬНАЕ ПАЛЯПШЭННЕ

Сутнасць спрыяльнага ўздзеяння чаю і кавы заключаецца ў антыаксідантах. Гэтым абумоўлена, напрыклад, выяўленая некаторымі даследчыкамі сувязь паміж ужываннем чаю і папярэджваннем раку яечнікаў. І ўсё ж такі пакуль нельга сцвярджаць, што вялікая колькасць чаю або кавы можа ліквідаваць небяспеку ўзнікнення анкалагічнага захворвання. Сёння ў вучоных ёсць толькі гіпотэзы адносна спрыяльных вартасцяў гэтых напояў. Адна справа — знайсці ўзаемасувязь паміж іх ужываннем і агульным паляпшэннем стану здароўя, і зусім іншая — выявіць прычынна-выніковыя сувязі, які даказалі б уплыў вялікіх аб'ёмаў чаю і кавы на магчымасць узнікнення анкалогіі. Для выяўлення прамой сувязі патрабуецца шматгадовае даследаванне з удзелам тысяч пацыентаў. Пакуль што ні ў кога няма сродкаў для правядзення такога кшталту навуковай работы.

ПРЫЕМНА ДУМАЦЬ

Чаго толькі не чуваць пра чай і каву!.. Маўляў, чай падыходзіць летуценнікам і меланхолікам, а кава — надта дзелавым. Праўда, захапленне чаем не перашкаджае кітайцам быць руплівымі і дзейнымі, а немцы вядуць за кавай павольныя размовы.

Пра каву кажуць, што яна знімае галаўны боль, стымулюе мозг і стравананне, папярэджвае ўзнікненне жоўцевых камянёў і рак печані, зніжае ўзровень халестэрыну, запавольвае прагрэсаванне хваробы Паркінсона…

Пра чай кажуць, што ён запавольвае старэнне, зніжае рызыку раку лёгкіх, стрававода, страўніка, падстраўнікавай залозы і прамой кішкі, зніжае стрэс, абараняе ад сонечных прамянёў, перашкаджае ўзнікненню карыесу… Не абавязкова ўсяму гэтаму верыць, але ж прыемна думаць, што кубачак чаю ці кавы прыносіць нейкую карысць.

Адных гэтыя напоі заспакойваюць, іншых танізуюць; нехта сцвярджае, што пэўная гарбата прыводзіць да пахудзення, а хтосьці нічога падобнага не заўважае. Што ж, у свеце існуе столькі гатункаў чаю і кавы і столькі спосабаў іх гатавання, што абагульняць проста немагчыма!

АПТЫМАЛЬНЫ АБ'ЁМ

Доза павінна быць разумнай. У дзень чалавеку дастаткова 4–5 кубкаў кавы або 3 кубкаў чаю. А злоўжыванне можа адбіцца на здароўі. Лішак кафеіну можа выклікаць пабочны эфект. Скажам, галаўны боль або расстройства стрававання.

Што да віду кавы/чаю, то нельга сказаць, каб нейкі з іх рэкамендавалі больш за іншыя. Вядома, што ў эспрэса менш кафеіну, чым у нефільтраванай каве. Зялёнаму чаю было прысвечана шмат даследаванняў, а вось белым амаль ніхто не займаўся. Таму немагчыма іх параўнаць. Тым не менш вядома, што празмернае захапленне чаем можа прывесці да зніжэння ўсмоктвання жалеза і адмоўна адбіцца на сэрцы. Тэін і кафеін ідэнтычныя па сваёй магчымасці выклікаць паскоранае сэрцабіццё, што хоць і бяспечна, але ж непрыемна.

Трэба разумець, што многае залежыць яшчэ ад асаблівасцяў кожнага чалавека. У адных абмен рэчываў дазваляе хутка засвоіць каву, і яны могуць заснуць, нават калі выпіюць яго позна ўвечары. У іншых жа метабалізм больш павольны, і яны не будуць спаць усю ноч.

Чулі — ведаем

Адзін з першых дэкрэтаў Леніна ў 1918 годзе быў скіраваны… на папулярызацыю ўжывання чаю. Кошт чаю залежаў не ад гатунку, а ад класавай прыналежнасці пакупнікоў. Рабочыя, члены прафсаюза, атрымлівалі чай бясплатна, а прадстаўнікі буржуазіі павінны былі плаціць максімальна высокую цану. Так Уладзімір Ільіч абараняў «развіццё рускай традыцыі». Хоць насамрэч камуністычны рэжым проста эканоміў. На імпарт чаю патрэбна было менш валюты, і яго можна было вырошчваць у Краснадары і Грузіі. Кава ж набывалася за мяжой — у Калумбіі і Індыі — у абмежаванай колькасці і прадавалася па завышаным кошце. Урэшце Савецкі Саюз выдатна авалодаў майстэрствам вытворчасці сумесяў «з кававым смакам» (у іх аснове быў, напрыклад, цыкорый).

Нягледзячы на тое, што кава прыйшла з Эфіопіі, распаўсюджванне яна атрымала дзякуючы арабам і на нашых прасторах асацыюецца з Захадам, у той час як чай — з Усходам.

Кава ў нейкім сэнсе застаецца ўрачыстым напоем. Так, дзе-небудзь «на выхадзе» мы звычайна аддаём перавагу каве, а дома — чаю. Гэта з-за таго, што добрую каву даволі цяжка прыгатаваць самому.

Ці роўныя чаю і каве створаныя на іх аснове напоі?

На жаль, не, бо там змяшчаюцца толькі экстракты, бедныя на ўвесь набор антыаксідантаў. А вось кафеіну і тэіну там шмат, з-за чаго частае ўжыванне апошніх не рэкамендуецца. Можа здавацца, што ты выпіў усяго кубак кавы, хоць некаторыя напоі кшталту Redbull адпавядаюць адразу чатыром.

Слушная парада

Ніколі не піце надта гарачую гарбату ці каву. Высокая тэмпература напою можа апячы стрававод!

■ Асаблівасці захворвання

«Павуцінка», «зорачка», вузельчык

Варыкознае расшырэнне вен сустракаецца прыкладна ў кожнага пятага

Прычым жанчын сярод гэтых хворых больш, чым мужчын. Зразумела, размова ідзе пра захворванне вен, але што з імі адбываецца не так?

Праблема ў нераўнамернасці прасвету і станчэнні сценак. Варыкознае расшырэнне вен можа ўзнікаць у розных органах, напрыклад, у страваводзе (пры партальнай гіпертэнзіі), семянным канаціку (варыкацэле). Найбольш часта сустракаецца пашкоджанне вен ніжніх канечнасцяў. Схільныя да гэтага людзі, чыя прафесія звязана з працяглым стаянням на нагах ці пад'ёмам цяжару. Важны фактар — спадчыннасць. У жанчын захворванне пачынае прагрэсаваць падчас цяжарнасці. Пасля другіх родаў амаль у паловы жанчын ёсць у рознай ступені праяўленыя прыкметы варыкознага захворвання. Значэнне таксама маюць лішняя вага і маларухомы лад жыцця.

— Пачынаецца ўсё абсалютна бяскрыўдна, так што можна спісаць непрыемныя адчуванні на стомленасць ці нязручны абутак, — расказвае **загадчык хірургічнага аддзялення 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Віктар ШВЕДАЎ.** — Першая візуальная прыкмета — сінія пражылкі, якія яшчэ называюць «павуцінкамі» ці «зорачкамі». Пасля з'яўляецца расшырэнне павярхоўна размешчаных вен — яны пачынаюць асабліва выпінаць над паверхняй скуры пасля хады, фізічнай нагрузкі. Ногі хутка стамляюцца, адчуваецца боль у лытках, сутаргі ў ікраножных мышцах (як правіла, ноччу). Паступова далучаюцца ацёкі (спачатку ў вобласці ступняў і шчыкалаткі, пасля — галёнкі). Ступень расшырэння з цягам часу нарастае, вены нагадваюць вузлы, скура над імі станчаецца, лёгка траўмуецца і пігментуецца. Цёмна-карычневыя плямы на скуры — вынік застарэлага і сур'ёзнага парушэння кровазвароту. Пры адсутнасці лячэння трафічныя змены паглыбляюцца і з'яўляецца язва.

Комплекснае, індывідуальнае, кансерватыўнае, аператыўнае

Пры неэфектыўнасці кансерватыўнага лячэння і далейшым прагрэсаванні захворвання патрабуецца хірургічнае ўмяшанне — выдаленне ўчастка вены (флебэктамія).

У некаторых выпадках, часцей як дапаможны метад, прымяняецца склератэрапія — увядзенне спецыяльнага прэпарату, які прыводзіць да зарастання расшыранай вены. Такім метадам выдаляюць «павуцінкі», невялікія расшырэнні дробных унутрыскурных і падскурных вен.

Найбольш сучасны метад выдалення варыкозных вен — лазерная фотакаагуляцыя. Выкарыстанне лазернага выпраменьвання робіць аперацыю менш траўматычнай.

Рабіце так

На пачатковай стадыі варыкозу гэтыя простыя правілы дазволяць запаволіць развіццё захворвання:

✓ Скіньце лішнюю вагу — яна павялічвае вянозны ціск.

✓ Пры вымушаным працяглым сядзенні/стаянні часцей мяняйце становішча, хадзіце ў перапынках у хуткім тэмпе. Пазбаўцеся звычкі сядзець нага на нагу.

✓ Пасля саўны, лазні, ванны аблівайце ногі халаднаватай вадой, паляжыце з высока ўзнятымі нагамі.

✓ Не насіце адзенне, якое пераціскае вены.

✓ Не насіце цесны, нязручны абутак. Вышыня абцасу — на больш за 4–5 см.

✓ Плавайце, хадзіце ва ўмераным тэмпе не радзей за 3–4 разы на тыдні па 30–40 хвілін. Не забывайцеся пра лыжы зімой, веласіпед летам. Рэгулярныя і камфортныя фізічныя нагрузкі — абавязковыя.

✓ Медыцынскі кампрэсійны трыкатаж спрыяльна ўплывае на вянозны адток. Эластычныя панчохі паскараюць кровазварот у глыбокіх венах і пазбаўляюць вянознага застою.

✓ Некаторыя гарманальныя прэпараты могуць пагоршыць стан вен. Не прымайце іх без кансультацыі ўрача.

✓ Час ад часу выконвайце простую **гімнастыку для ног.**

— Лежачы або седзячы згінайце і разгінайце ступні ў галёнкаступнёвым суставе (1–2 хвіліны).

— Пахадзіце на месцы, не адрываючы наскоў ад падлогі (1–2 хвіліны).

— Пакладзіце ногі на ўзвышша (5–10 хвілін).

■ Сезонныя парады

ВЫПРАБАВАННЕ ЛЁДАМ

Летам можна ўпасці з веласіпеда, а зімой дастаткова проста ісці па дрэнна ачышчанай ад снегу і лёду дарозе. Адзін неасцярожны рух — і прывітанне, галалёдная траўма. Урач-траўматолаг-артапед 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Дзмітрый АЎХІМОВІЧ нагадвае, як важна не спяшацца зімой.

1. Хадзіце там, дзе менш лёду, дарожкі пасыпаны пяском.

2. Не насіце абцасы, няхай абутак будзе больш устойлівым, а падэшва не слізкай.

3. Не паднімайце высока ногі. Перасоўвацца трэба як лыжнік, невялікімі крокамі, наступаючы на ўсю падэшву.

4. Не трымайце рукі ў кішэнях, у вас не хопіць часу дастаць іх у момант падзення.

5. Пажылым лепей браць з сабой кій, а цяжарным наогул не хадзіць без суправаджэння.

6. Вельмі ўважлівымі будзьце каля і на праезнай частцы. Аўтамабіль не спыніцца на раз-два.

7. Трымайцеся за ручку выходзячы з грамадскага транспарту. І не бегайце за ім.

8. Памятайце, што алкаголь зніжае адчувальнасць да болю, а таму многія атрымліваюць сур'ёзныя траўмы, але не адразу звяртаюцца па дапамогу.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

Светлыя знакі сяброўства

У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет серыя кніг кітайскіх паэтаў на беларускай мове

У серыі кніг «СВЕТЛЫЯ ЗНАКІ: ПАЭТЫ КІТАЯ» чатыры паэтычныя зборнікі прадстаўляюць мастакоў слова розных часін — Ван Вэя, Ду Фу, Лі Бо, Ай Ціна. У кнігах пададзены і пераклады, зробленыя ў розныя дзесяцігоддзі — Уладзімірам Дубоўкам і Рыгорам Барадуліным, а ў найбліжэйшы час — Міколам Мятліцкім, Таццянай Сівец, Рагнедам Малахоўскім, Навумам Гальпяровічам. Над падрыхтоўкай серыі да друку працаваў аўтарытэтны міжнародны савет (акрамя беларускага боку ў склад яго ўвайшлі перакладчыкі і паэты з Азербайджана і Кітая — Чынгіз Алі аглу і Гао Ман). Сам творчы праект наступным чынам пракаменціраваў кітайскі пісьменнік Гао Ман (нараджэннем з 1926 года, ён яшчэ напрыканцы 1950-х гг. пераклаў кнігу вершаў Максіма Танка на кітайскую мову):

— Задуманы і часткова рэалізаваны беларускімі калегамі праект, прызнацца, ураўражае. Гэта як своеасаблівы рэнесанс ці, даклад-

ней, узлёт у кітайска-беларускіх мастацкіх і літаратурных стасунках. Новыя пераклады ў дадатак да ранейшых дазваляюць гаварыць пра стварэнне школы беларускага мастацкага перакладу ў звязцы з кітайскай літаратурай. Я вітаю беларускіх сяброў у сувязі з такой працай! І вельмі спадзяюся, што поруч з увагай да класічнай літаратуры такая ж цікавасць будзе праяўлена да сучаснай паэзіі і прозы. Кітаю ёсць што паказаць і расказаць свету. І відаць па ўсім, што ў беларускай мове існуе ўвесь арсенал магчымых мастацкіх сродкаў здзейсніць гэты паказ і гэтае адлюстраванне.

Адна з укладальніц серыі — рэдактар Вольга Аляксеева падкрэслівае, што, дзякуючы рабоце над кнігамі з праекта «Светлыя знакі: паэты Кітая», ёй нашмат болей адкрыўся Кітай, яго культура і літаратура. «Веру, што серыя прадоўжыць сваё існаванне, — гаворыць Вольга Аляксеева. — Ведаю, што перакладчыцкая праца ўдзельнікамі праекта працягваецца. Думаю, што будзе ў серыі з часам прадстаўлена і сучасная паэзія. Вельмі хацелася б убачыць і беларускія кнігі Цюй Юаня — першага вядомага паэта Кітая, геніяльнай паэтэсы Лі Ціньчжаа. Дарэчы, да засваення іх спадчыны ўжо падступіліся нашы паэты...»

Іерогліфы, што азначаюць у перакладзе «светлыя знакі», становяцца праваднікамі сяброўства



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Вольга АЛЯКСЕЕВА, укладальнік серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая»; Анатоль ЗВАНАРОЎ, мастак серыі «Светлыя знакі...»; Вячаслаў ПАЎЛАВЕЦ, мастацкі рэдактар Выдавецкага дома «Звязда».

дзвюх яркіх і багатых літаратур — кітайскай і беларускай. Нагадаем, што ў розныя гады ў Пекіне і іншых гарадах Паднябеснай былі выдадзены кнігі беларускіх пісьменнікаў: Янкі Купалы, Аркадзя Куляшова, Івана Шамякіна (каля дзесяці яго раманаў і аповесцяў!), Петруся Броўкі, Янкі Маўра, Кандрата Крапівы, Васіля Быкава, Святланы Алексіевіч...

Павел АЛЬСОВЫ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	**Лот № 1. Одноэтажный бревенчатый жилой дом, общей площадью 50,2 кв.м с земельным участком площадью 0,2500 га с кадастровым номером 22088702460100014, стоимостью 466 200 000 рублей**
Собственник (владелец) имущества	Лютько Николай Николаевич
Местонахождение (адрес) имущества	д. Красногорка Браславского района
Информация об обременениях	Земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 В, площадь 0,0106 га. Земли, находящиеся в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов, площадью 0,2500 га
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Витебская обл., г. Браслав, ул. Красноармейская, д. 8, каб. 15. 26 февраля 2015 года в 10.00
Справочная информация	Отдел принудительного исполнения Браславского района, 211970, Витебская обл., г. Браслав, ул. Красноармейская, д. 9. Начальник отдела — Чернявский Иван Никодимович, тел. 8 021 536-25-85
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Браславского района № 3642903000074 в РКЦ № 205 в г. Браслав филиала № 214 в г. Новополоцк ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801660, УНП 300002505, не позднее 16.00 25.02.2015. Минимальная величина первого шага — 5 процентов стоимости каждого лота. В соответствии со ст. 486 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Строительный трест №8» (продавец) проводит открытый аукцион

по продаже производственного корпуса,

инвентарный номер 100/С-38910, общей площадью 744,9 кв.м, расположенного по адресу: г. Брест, ул. Гродненская, 49/1.

Начальная цена лота с НДС (20 %) – 2 133 146 400 бел.руб.
Объекты недвижимости расположены на земельном участке пл. **0,3874 га**, предоставленным продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственного здания.
Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения аукциона.
Условия оплаты за объект: оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Дата, время и место проведения аукциона:	**09.03.2015 г. в 14.00** по адресу: г. Брест, б-р Шевченко, 4, зал заседаний – каб. 230, 231.
Срок окончания приема документов для участия в аукционе:	Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.03.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

Тел.: +375 17-280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 426162.

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды.

Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым № 221280600001000295, площадью 1,2000 га, расположенного по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, севернее поселка Витьба для строительства и обслуживания аптечного склада оптовой реализации готовых лекарственных средств (1 16 09 размещение объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг). Ограничения: охранная зона линий электропередачи до 1000В. **Начальная цена** права заключения договора аренды: 36 906 340 бел. руб. **Размер задатка:** 3 690 000 бел. руб.

Дата, время и место проведения аукциона: **10.03.2015 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: **с 04.02.2015 с 8.30 по 09.03.2015 до 17.30** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314000018 в филиале № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 150801635, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области. **Условия:** не позднее 2 рабочих дней после внесения платы за право заключения договора аренды и возмещения затрат обратиться в Витебский райисполком за заключением договора аренды зем. участка; в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды, но не позднее 3 месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона аренды несостоявшимся обратиться в организацию по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним за гос. регистрацией права на зем. участок; получить разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательных работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; отвод зем. участка производится с правом вырубки древесно-кустарниковой растительности, вырубку произвести победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона с реализацией древесины в установленном порядке; в случае, если размер платы за право заключения договора аренды зем. участка превышает более 1000 базовых величин для граждан, 2000 базовых величин для индивидуальных предпринимателей и 10000 базовых величин для юр. лиц, при желании получить рассрочку по внесению платы за право заключения договора аренды зем. участка в двухдневный срок со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Витебский облисполком с заявлением о предоставлении рассрочки.

Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды.

Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 15 лет земельного участка с кадастровым № 222150100001001990, площадью 0,0136 га, расположенного по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. Докшицы, ул. Ленинская (участок № 3) для строительства и обслуживания торгового павильона по торговле непродовольственной группой товаров (1 16 03 размещение объектов розничной торговли). Ограничения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Начальная цена** права заключения договора аренды: 5 513 322 бел. руб. **Размер задатка:** 551 000 бел. руб.

Лот № 2. Право заключения договора аренды сроком на 15 лет земельного участка с кадастровым № 222150100001001758, площадью 0,0260 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, г. Докшицы, ул. Гайдара под строительство торгового объекта (1 16 03 размещение объектов розничной торговли). Ограничений в использовании зем. участка нет. **Начальная цена** права заключения договора аренды: 10 969 740 бел. руб. **Размер задатка:** 1 096 000 бел. руб.

